Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!

# ЗЬВЯЗДА

№ 241 (3349) Нядзеля, 20 кастрычніка 1929 г.

Орган Цэнтральнага і Менскага Камітэтаў Камуністычнай Партыі (б) Беларусі

Адрас рэд. і канторы: Менск, Савецкая, 63
ШТОДЗЕННАЯ ГАЗЭТА, ГОД ВЫДАНЬНЯ XIII
Тэлефоны: рэдактар—1074, сакратар—819, кантора—781

МАСКВА, 19. Нар. Кам. па зам. справах атрымаў з Кабулу радыёграму ад аўганскага мін. зам. спраў, у якой гаворыцца, што новы аўганскі ўрад жадае падтрымліваць найлепшыя адносіны з савецкім урадам. У адказ на гэта тав. Карахан паведаміў мін. зам. спраў Аўганістану, што ўрад СССР з задаваленьнем прымае да ведама заяву аўганскага ўраду аб добрасуседзкіх адносінах паміж абедзьвюма дзяржавамі.

ЯНОШНІЯ НАВІНЫ Б. С. С. Р.

Згодна пастановы Саюзнага Дзяржпляну, у БССР мяркуецца адкрыць тэхнікум па дрэваапрацоўцы, 2 прафшколы, 18 вучэбных майстэрань і курсы для тэхнічнага пэрсаналу па тэрпэнтыннай прамысловасьці. На ўсё гэта будзе асыгнавана 500 тыс. рублёў.

# БССР ДАСЬЦЬ БУЛЬБУ МАСКВЕ І ЛЕНІНГРАДУ

## У бліжэйшыя дні адправім чырвоныя эшалёны бульбы ў пралетарскія цэнтры

## Час не чакае, надыходзяць маразы, узмоцнім загатоўкі бульбы, выканаем пляны раней тэрміну

## Калгасы і саўгасы,—у першыя рады здатчыкаў лішкаў бульбы; тэрмінова нагружайце цягнікі бульбай для маскоўскіх і ленінградзкіх рабочых

## Беднота і сераднякі,—здавайце бульбу, арганізуйце чырвоныя абозы

## Партыйныя арганізацыі, камсамол, прафсаюзы,--усе на ўзмоцненую работу па загатоўцы бульбы!

## На фронце загатовак бульбы

Становішча з загатоўкаю і адгрузкаю бульбы выразна малююць наступныя лічбы: да 15-га лістапада з БССР павінна быць вывезена ў Ленінград і Маскву 4 мільёны пудоў з агульнага гадавога заданьня ў 6 мільёнаў пудоў; на сёнешні-ж дзень фактычна вывезена ўсяго каля 250 тыс. пуд.

Прычынай такой слабой працы ў гэтай галіне зьяўляецца ПОЎНАЕ НЕРАЗУМЕНЬНЕ ЗАГАТОЎЧЫМІ АРГАНІЗАЦЫЯМІ ЗАДАЧЫ СВАЯЧАСОВАЙ ЗАГАТОЎКІ І АДГРУЗКІ БУЛЬБЫ Ў ПРАЛЕТАРСКІЯ ЦЭНТРЫ. Да гэтага часу загатоўка бульбы яшчэ не разгорнута як беларускімі арганізацыямі, так і прадстаўніцтвамі маскоўскіх і ленінградзкіх загатоўчых арганізацый. Гэтыя прадстаўніцтвы ўжо некалькі тыдняў, як знаходзяцца ў БССР, але фактычна нічога не зрабілі. Толькі зараз яны прыступаюць да арганізацыі сваіх загатоўчых пунктаў.

Што датычыць беларускіх загатоўчых арганізацый — Белсельсаюзу і Белкаапсаюзу, — дык з іх боку наглядаюцца зусім недапушчальныя адносіны да кампаніі загатовак бульбы. Да апошняга моманту яшчэ мае месца чыста камэрцыйны падыход нашых загатоўшчыкаў да гэтае важнае задачы. Нашы каапэрацыйныя сыстэмы ня ўжылі належных мер да разгортваньня кампаніі з тае прычыны, што яны лічаць сябе нездаволенымі вызначанай ім надбаўкай на гандлёвыя і накладныя выдаткі. Гэта надбаўка складае 16 кап. з пуду і яе хопіць ня толькі на фактычныя выдаткі. Такім чынам, трэба канстатаваць поўнае неразуменьне каапэрацыяй палітычнай важнасьці тэрміновай адгрузкі бульбы для пралетарскіх цэнтраў СССР. НАШЫ ЗАГАТОЎШЧЫКІ ЗАМЕСТ ТАГО, КАБ РАЗГАРНУЦЬ СЯРОД СЯЛЯНСТВА НАЛЕЖНУЮ РАСТЛУМАЧАЛЬНУЮ КАМПАНІЮ, КАБ АРГАНІЗАВАЦЬ ГЭТУ ПРАЦУ НА МЯСЦОХ І ПРЫСТУПІЦЬ ДА АДГРУЗКІ, ЗАНЯЛІСЯ ТОРГАМ ЗА РАЗЬМЕР НАКЛАДНЫХ ВЫДАТКАЎ І ЎНЕСЬЛІ ДЭМАРАЛІЗАЦЫЮ Ў НАСТРОІ МЕСЦ.

Трэба дадаць, што МЯСЦОВЫЯ ПАРТЫЙНЫЯ І ГРАМАДЗКІЯ АРГАНІЗАЦЫІ ТАКСАМА НЕ ЗЬВЯРНУЛІ НІЯКАЕ ЎВАГІ НА КАМПАНІЮ БУЛЬБАЗАГАТОВАК. Прамысловасьць-жа, спадзяючыся на самацёк, ня ўжыла ніякіх мер да здачы бульбы кантрактантамі.

Становішча пагоршвалася яшчэ радам іншых прычын. КУЛАЦКАЯ І ЗАМОЖНАЯ ЧАСТКА ВЁСКІ СЬВЯДОМА ЗАТРЫМЛІВАЕ ЗДАЧУ БУЛЬБЫ, думаючы, што цана на бульбу будзе павышана. АДЗНАЧАН РАД ВЫПАДКАЎ АЖЫЯТАЖУ, які ствараюць самі загатоўшчыкі. Павышэньне цаны робіцца пад выглядам розных даплат за дальнасьць перавозкі. Прамысловасьць павялічвае ўстаноўленую цану, скарыстоўваючы дазвол прэміяваць здатчыкаў за бульбу з павышанай крухмальнасьцю.

Пэўная частка віны за становішча на бульбяным рынку ляжыць і на Наркамгандлі БССР, які слаба рэагаваў дагэтуль на недапушчальныя ненармальнасьці і які не рабіў амаль ніякага нацiску на загатоўчыя арганізацыі.

Зараз Наркамгандаль знэргічна ўзяўся за інструктаваньне месц. Сёньня тэлеграфна даны цьвёрдыя заданьні кожнай акрузе аб тэй колькасьці бульбы, якую павінна адгрузіць тая ці іншая арганізацыя, якая працуе на тэрыторыі данае акругі.

Посьпех кампаніі на мясцох залежыць ад таго, наколькі разварушацца нізавыя загатоўчыя арганізацыі і наколькі мясцовыя партыйныя і грамадзкія арганізацыі здолеюць мабілізаваць увагу бяднацка-сераднацкіх мас вакол пытаньня аб патрэбнасьці тэрмінова забясьпечыць бульбай рабочыя цэнтры, наколькі будзе рашучым наш нацiск на кулака. В.

## Зах. Беларусь--на лаўцы падсудных

### Рыхтуецца 8 вялікіх палітычных працэсаў

ВАРШАВА, 19. У працягу бліжэйшага месяца ў Зах. Беларусі мае адбыцца 8 вялікіх палітычных працэсаў, У Беларусі, бадай, няма піводнага буйнога гораду, у якім-бы у бліжэйшы час не прадстаяла вялікага палітычнага працэсу.

## Арышт рабоча-сялянскіх дэлегатаў

ВАРШАВА, 19. У апошнія дні па фабрыках і заводах разгортваецца энэргічная кампанія ў абарону польскае рабоча-сялянскае дэлегацыі, якая езьдзіла ў СССР. Прымаюцца рэзалюцыі салідарнасьці з дэлегатамі і выносяцца патрабаваньні аб тым, каб дэлегатам была забясьпечана магчымасьць здаць справаздачу аб усім, што яны бачылі ў СССР. Першыя дэлегаты, якія вярнуліся з СССР у Лодзь, арыштаваны.

## ПЕРАД АПОШНЯЙ БОЙКАЙ СУПРОЦЬ АПАЗЫЦЫІ

ВАРШАВА, 19. Паводле паведамленьня газэты «Глос Польскі», пілсудчыкі пераходзяць у контр-наступленьне. Пілсудскі, па думцы газэты, ня хоча заўчасна выкрываць свае пляны, аднак, ён «асабіста мае намер кіраваць апошняй бойкай супроць апазыцыі». Гэтым і тлумачыцца адмова Пілсудзкага ад паездкі ў Італію. Стратэгічны плян пілсудчыкаў наступны: першы ўгон адкрые беспартыйны блёк, потым выступіць урад і нарэшце апошнім зьявіцца на сцэне сам Пілсудскі.

## Надыр-хан абвешчаны нацыянальным гэроем

ЛЁНДАН, 18. Рэйтэр паведамляе: «Паводле вестак, якія паступаюць у Аўганскую місію ў Лёндане, новы кароль Надыр-Хан абвешчаны нацыянальным гэроем. Правадыры ўсіх пляменьняў прысягаюць на вернасьць новаму падышаху. (ТАСС).

## Нота СССР Нанкінскаму і Мукдэнскаму ўрадам

### Прыгавор над 37 савецкімі грамадзянамі—чарговая подласьць кітайскай ваеншчыны

### Ад Народнага Камісарыяту Замежных Спраў

МАСКВА. 18-га кастрычніка, Народны Камісарыят Замежных Спраў уручыў нямецкаму пасольству ў Маскве ніжэйпаданую заяву з просьбай давесьці яе да ведама нанкінскага і мукдэнскага ўрадаў:

«27-га мая ў часе налёту на генэральнае консульства ў Харбіне было арыштавана 37 савецкіх грамадзян — наведвальнікаў генэральнага консульства. Ня гледзячы на патрабаваньне аб іх вызваленьні, заяўленае Саюзным урадам у яго ноце ад 31-га мая, яны на працягу многіх месяцаў знаходзіліся зьняволенымі. Супроць іх быў інсцэніраваны судовы працэс, які зьяўляецца спробай апраўдаць беззаконны налёт на генэральнае консульства і арышт савецкіх грамадзян, якія там знаходзіліся.

Гэты працэс прайшоў з поўным ганьбаваньнем устаноўленых правіл і парадку вядзеньня суду. Усе хадайніцтвы абвінавачаных і абароны аб выкліку сьведак, аб вочнай стаўцы і г. д. суд адхіліў на тэй аснове, што яму і да працэсу было ўсё ясна. Абвінавачаныя не маглі дабіцца нават таго, каб ім былі прад'яўлены арыгіналы ўсіх «дакументаў», якія ўжо шмат разоў выкрываліся Саюзным урадам, як фальшыўкі, і якія служылі для арыштаваных адзіным абвінаваўчым матар'ялам.

Працэс падобнага роду ня мог ня выклікаць мацнейшага абурэньня ня толькі ў СССР, але і ў грамадзкай думцы іншых краін і самога Кітаю. Тым ня менш 15-га кастрычніка быў ўхвалены прысуд, на падставе якога абвінавачаныя прыгавораны да доўгага зьняволеньня ў турме на розныя тэрміны.

Саюзны ўрад вымушаны канстатаваць, што, як паказаў увесь ход працэсу, ён зьяўляецца АГІДНАЙ СУДОВАЙ КАМЭДЫЯЙ, ЯКОЙ САЮЗНЫ УРАД НЕ ПРЫДАЕ НІЯКАГА ЮРЫДЫЧНАГА ЗНАЧЭНЬНЯ І ЯКУЮ ЁН РАЗГЛЯДАЕ, ЯК ПРЫКРЫЦЬЦЁ ЧАРГОВАЙ ЗЛАЧЫННАЙ РАСПРАВЫ НАД САВЕЦКІМІ ГРАМАДЗЯНАМІ».

### Пратэст рабочых Харкаву

ХАРКАЎ, 18. На ўсіх буйных прадпрыемствах Харкава адбыліся мітынгі пратэсту супроць наглага прыгавару кітайскага суду над савецкімі грамадзянамі.

### „Норд Чайна Дэйлі Мэйль" аб працэсе 38 у Харбіне

ПЭЙПІН, 18. «Норд Чайна Дэйлі Мэйль» зьмяшчае артыкул аб працэсе 38-мі ў Харбіне. Падрабязна малюючы працэдуру суду, газэта прыходзіць да вываду: харбінскі працэс увойдзе ў гісторыю, як адзін з самых яскравых прыкладаў таго, што такое кітайская юстыцыя. Працэс даў яшчэ адну ілюстрацыю абсалютнай няпрыгоднасьці кітайскага суду. (ТАСС).

## БАРАЦЬБА ПРАЦЫ З КАПІТАЛАМ

### Латыскі пралетарыят дае рашучы адпор фашызму

### ЗАБАСТОЎКІ ПРАТЭСТУ ПА УСЁЙ ЛАТВІІ

ЛАТЫСКІ ПРАЛЕТАРЫЯТ ДАЕ РАШУЧЫ АДПОР ФАШЫЗМУ

РЫГА, 18. Забастоўка, абвешчаная латыскімі рабочымі арганізацыямі ў знак пратэсту супроць новага закону аб больнічных касах, праходзіць вельмі пасьпяхова. У Рызе бастуюць партовыя рабочыя, рабочыя трамваю, камунальнікі і да 70 проц. фабрычна-заводзкіх рабочых. Урадавыя ўстановы, пошта, тэлеграф, чыгуначныя станцыі, вадаправод і электрастанцыя заняты войскам і атрадамі фашысцкай арганізацыі. У правінцыяльных гарадох забастоўка прыходзіць яшчэ больш пасьпяхова. Паліцыя разганяе і арыштоўвае ўсіх сабраўшыхся. Сёньня ў Рызе арыштаваны каля 80 чалавек.

Ня гледзячы на заклік сац.-дэмакратаў ня прымаць удзелу ў дэманстрацыі, сёньня раніцай 1.500 рабочых выйшлі на дэманстрацыю з чырвонымі сьцягамі і камуністычнымі лёзунгамі. Дэманстрацыя была разагнана. Вечарам сац.-дэмакраты апублікавалі бюлетэнь, у якім усяляк заклікаюць рабочых ня слухаць маскоўскіх лёзунгаў, адмовіцца ад парад маскоўскіх агентаў, якія ўносяць раскол у рабочы рух і не абарочваць аднадзённую забастоўку ва ўсеагульную. Належыць адзначыць, што сацыял-дэмакратычныя рабочыя пачалі ўчора баставаць не з 12 гадзіны ночы, як заклікалі сацыял-дэмакратычныя лідэры, але ўжо з 6-7 гадзін вечара.

### Канфлікт у вугольнай прамысловасьці Польшчы

ВАРШАВА, 18. Прафсаюз гарнякоў зьвярнуўся да прадстаўнікоў горнай прамысловасьці Дамброўскага раёну з патрабаваньнем аб павышэньні зарплаты на 20 проц. Капіталістыкі адказалі на гэта згодаю падняць зарплату на 3 проц. Перагаворы спынены. Прафсаюз пагражае забастоўкай. Адначасовыя канфлікты ў Дамброўскім і Сілескім вугальных раёнах ставяць польскую вугальную прамысловасьць перад небясьпекай сур'ёзнага крызісу.

### Бэрлінскія трубапракладчыкі трымаюцца стойка

БЭРЛІН, 16. Учора адбыўся сход бастуючых бэрлінскіх трубапракладчыкаў, прысьвечаны абгаварэньню забастоўкі. Лідэр бастуючых Нідэркірхнэр заявіў, што радасьць сацыял-фашысцкай прафсаюзнай бюракратыі і прэсы, якія цьвярдзяць, быццам апошнія сілы бастуючых вычэрпваюцца, ня мае ніякай падставы. У заключэньне свайго дакладу Нідэркірхнэр запрапанаваў ад імя цэнтральнага забастовачнага камітэту працягваць барацьбу. У выніку галасаваньня большасьцю ўсіх галасоў была вынесена пастанова працягваць забастоўку. (ТАСС).

### Дэманстрацыя рэвалюцыйнай моладзі ў Бэрліне

БЭРЛІН, 18. Учора Бэрлінская рэвалюцыйная моладзь правяла дэманстрацыю пратэсту супроць зьніжэньня дапамогі беспрацоўным і ўзмоцненай эксплёатацыі моладзі. Паліцыя, аднак, перашкодзіла дэманстрацыі і, уздоўшыся за гумовыя дубінкі, пачала арыштоўваць дэманстрантаў. Адначасова «Сталёвы Шлём» пазначае на пядзелю агітацыйны паход. Бэрлінская арганізацыя камуністычнай партыі і «Ротэ Фана» заклікаюць працоўных Бэрліну сабрацца ў рабочых кварталах для таго, каб належным чынам адказаць на фашысцкія правакацыйныя дэманстрацыі. У апошнюю хвіліну Бэрлінскі паліцэй-прэзыдэнт забараніў дэманстрацыі, якія меркаваліся на пядзелю, як фашысцкую, так і камуністычную контрдэманстрацыю.

### Прасьледваньне камуністых у Амэрыцы

НЬЮ-ЁРК, 18. У Чыкага паліцыя арабіла налёт на памяшканьне мясцовай арганізацыі кампартыі і арыштавала двух членаў ЦК і яшчэ 25 камуністых толькі на падставе таго, што яны члены кампартыі. (ТАСС).

### Белы тэрор у Баўгарыі

ВЕНА, 16. У Баўгарыі надыходзіць рад буйных палітычных працэсаў на аснове закону аб абароне дзяржавы. 21-га кастрычніка ў акруговым судзе будзе слухацца справа членаў ЦК баўгарскай кампартыі. 23-га кастрычніка ў Сьлівенскім акруговым судзе пачнецца працэс некальких работнікаў рабочай партыі ў Сьлівені, арыштаваных у зьвязку з 1-м жніўня. Абодвы працэсы прыцягваюць вялікую ўвагу рабочых мас. (ТАСС).

## Папраўка

У № 240 газэты «Зьвязда», ад 19-га кастрычніка, на першай старонцы ў заметцы пад загалоўкам «Выканаем плян загатовак бульбы» па недаглядзе супрацоўніка рэдакцыі ўкралася памылка. З другога сказу трэба чытаць так: «Пляны загатовак бульбы даводзяцца да сяла і кулацкага заможнага двара. Прымаюцца меры да стварэньня таварнага фонду для сялянскіх дзейнічаньня загатоўкам бульбы».

## За энэргічную рэалізацыю пастановы ЦК і ЦКК

### АБ ЧЫСТЦЫ САВЕЦКАГА АПАРАТУ

Пастанова ЦК і ЦКК аб чыстцы савецкага апарату, якая была нядаўна апублікавана, зазначала на тое, што якасьць праверкі не дае чакаемых намі вынікаў, што савецкія, прафэсыянальныя і партыйныя арганізацыі, а таксама і органы РСІ ня ўлічылі ў выстарчальнай меры ўсёй палітычнай важнасьці і вялізнага значэньня чысткі савецкага апарату. Асноўны сэнс пастановы зводзіўся да таго, што зараз трэба дабіцца рашучага крутога пералому гэтай важнейшай справе.

Каб чыстка была праведзена з патрэбнай сур'ёзнасьцю ЦК і ЦКК рашылі згуртаваць работу па чыстцы на блажэйшы час толькі ў органах Наркамфіну і Наркамзему. Ня прыходзіцца даводзіць, што дапер, ва ўмовах абастрэньня клясавай барацьбы, выразна клясава-вытрыманая работа названых органаў, якія маюць блізкае дачыненьне з капіталістычнымі элемэнтамі гораду і вёскі, набывае асабліва важнае значэньне. Зямельныя органы павінны стаць сапраўднымі арганізатарамі соцыялістычнага перабудаваньня вёскі.

Між тым практычная работа і асабісты склад зямельных органаў знаходзяцца далёка не на належнай вышыні. Добра вядомы шматлікія выпадкі нецярпімага скажэньня клясавай лініі. Даволі ўзяць Наркамзем Беларусі, Сібір, Ніжні-Ноўгарад, Волагду і г. д., нарэшце, Ленінград і Маскву. За апошні час выкрыты таксама рад фактаў скрыўленьня клясавай лініі, дапушчаных фінансавымі органамі ў многіх гарадох. З часу апублікаваньня пастановы ЦК і ЦКК прайшло больш месяца. Якое-ж становішча цяпер? Трэба з усёй рашучасьцю заявіць: ня гледзячы на тое, што ў некаторых мясцох ёсьць невялікія зрухі, работа па чыстцы ўсе яшчэ праходзіць нездавальняюча. У перадавожачай большасьці месц яшчэ надзвычайна мала робіцца для дасягненьня таго пералому, аб якім гаворыць пастанова ЦК і ЦКК. З Ташкента, напрыклад, паведамляюць, што чыстка апарату ў Сярэдняй Азіі адбываецца недапушчальна марудным тэмпам. Тыя-ж весткі паступаюць з Рязані. Паранейшаму пасьпуны і часткова зусім адхіляюцца ад чысткі прафсаюзы. Яны невыстарчальна актыўна мабілізуюць масы, слаба прыцягваюць рабочых і слаба вядуць работу па выдучэньні. Паранейшаму дрэнна абстаіць справа з прыцягненьнем камсамолу да чысткі савецкага апарату. Акрамя гэтага яшчэ невыстарчальна прыцягненьне рабочых і невыстарчальна разгорнутая самакрытыкі ў часе чысткі, асабліва трэба адзначыць і тое, што вельмі часта кіраўнікі ўстаноў, якія правяраюцца, ня толькі не дапамагаюць пасьпяховаму правядзеньню чысткі, але нават перашкаджаюць гэтаму, перашкаджаюць выяўляць недахваты, зьнімаць нягодных працаўнікоў. З гэтым бюракратычным прыкрыцьцем трэба павесьці самую рашучую барацьбу. Трэба зьнішчыць адзін з буйнейшых недахватаў чысткі, які заключаецца ў тым, што чыстка часта абарочваецца ў праверку асабовага складу і надзвычайна мала ўдзяляе ўвагі праверцы работы ўстановы.

Адкідаючы лішняе зацягваньне чысткі, трэба адначасова змагацца з празмернай прыспешанасьцю. Усе адзначаныя недахваты трэба самым тэрміновым парадкам зьнішчыць. Трэба мабілізаваць шырокія рабочыя і бядняцкія масы і абярнуць чыстку на падставе разгорнутай самакрытыкі ў сапраўдны агляд работы савецкага апарату. Вялізную карысьць могуць і павінны прынесьці рабочыя брыгады, якія прыходзяць на дапамогу РСІ пры правядзеньні чыстак. Партыйныя арганізацыі павінны энэргічна ўзяцца за сыстэматычнае і непаслабнае кіраўніцтва чысткай. Трэба энэргічна ўзяцца за рэалізацыю пастановы ЦК і ЦКК. («Правда»).

## БЭРЛІНСКІЯ РАБОЧЫЯ АБГАВОРВАЮЦЬ САВЕЦКУЮ ПЯЦІГОДКУ

БЭРЛІН, 19. У Бэрліне адбылося пасяджэньне мясцовага антываеннага камітэту, якое сабрала вялікі лік делегатаў. У пасяджэньні прымалі ўдзел прадстаўнікі фабзаўкомаў, рэвалюцыйныя ўпоўнаважаныя з прадпрыемстваў і прафсаюзныя работнікі і г. д. З дакладам аб савецкай пяцігодцы выступіў член ЦК нямецкае кампартыі Нэйман. Дакладчык падкрэсьліваў вялікае значэньне пяцігадовага пляну як для СССР, так і для сусьветнай рэвалюцыі. У наступнай за тым дыскусіі член ЦК КПН тав. Тэльман пад гучныя апляўдысмэнты прысутных супроць паставіў савецкую пяцігодку пляну Юнга.

Канфэрэнцыя абрала рабочую делегацыю для паездкі ў СССР на сьвяткаваньне 12-й гадавіны Кастрычнікавай рэвалюцыі. Пад бурныя авацыі канфэрэнцыя ўхваліла паслаць прывітальную тэлеграму т. Сталіну.

## Ангельская рабочая дэлегацыя выяжджае ў СССР 26 кастрычніка

ЛЁНДАН, 19. Рабочая дэлегацыя ў СССР, якую арганізавала таварыства прыхільнікаў Савецкага Саюзу, будзе складацца прыблізна з 30 рабочых, якія будуць абраны самімі рабочымі. У дэлегацыю ўвойдуць пэсьць жанчын. Дэлегацыя выяжджае з Лёндана 26 кастрычніка.

## ПЕРАД НОВАЙ КАМЭДЫЯЙ „РАЗБРАЕНЬНЯ" ПАТРАБАВАНЬНІ ІТАЛІІ

РЫМ, 18. Згодна «Попалё д'Італія» на Лёнданскай морскай канфэрэнцыі італьянская делегацыя будзе бараніць наступныя асноўныя палажэньні:

1) Узаемная залежнасьць паміж абмежаваньнем морскіх, сухапутных і паветраных узбраеньняў;

2) Пашырэньне абавязкаў аб абмежаваньні ўзбраеньняў таксама і на меншыя краі;

3) Устанаўленьне абмежаванае нормы для ўсяго флёту, а не для асобных катэгорый суднаў;

4) Згоду на любое скарачэньне морскіх узбраеньняў, абы разьмер італьянскага флёту ня ўступаў флёту любое другое кантынэнтальнае дзяржавы;

5) Забарона будаваць да 1936 году судны з вадазьмяшчэньнем звыш 10.000 тон.

## На фронце электрафікацыі



## У Донбасе пабудавана новая электрастанцыя ў 25.000 клвт.

Пры гуце ў Канстантантынаўцы, Арцёмаўскае акругі Донбасу, капчаецца пабудова новае электрастанцыі, разлічанае на 25 тыс. клвт. Акрамя абсталяваньня, якое ідзе з Ленінграду, на гэтым заводзе будуць выраблены і ўсе дапаможныя прылады. Гэта электрастанцыя будзе перадаваць энэргію цынкаплавільнаму і супэрфасфатнаму заводам, якія павінны быць перададзены ў эксплёатацыю ў наступным годзе.

На здымку: агульны выгляд электрастанцыі.

## Савецкія электра-плавільныя печы



Упяршыню ў СССР пачаўся выпуск электраплавільных печей.

Печы, якія выдаўна пастаўлены ў замежных, але часта лепшыя ад апошніх.

# Камуністыя калгасаў і саўгасаў—у першыя рады барацьбітоў за сацыялістычную перабудову вёскі

## За рашучае паляпшэньне партыйнай работы ў калгасах і саўгасах

(Да нарады сакратароў саўгаскіх і калгаскіх ячэек КПб()Б

Сёньня адкрываецца ўсебеларуская нарада сакратароў саўгаскіх і калгаскіх ячэек. Нарада абмяркуе два пытаньні, якія маюць асабліва вялікае значэньне, аб чарговых задачах партыйнай, выхаўчай і масава-палітычнай работы ў калгасах і саўгасах і пытаньне аб становішчы калгасаў і мерапрыемствах па ўмацненьні іх.

На падставе шырокага абмеркаваньня гэтых пытаньняў, асабліва аб чарговых задачах партыйнай работы, высьветліўся практычны вопыт работы ячэек, паказаны быць распрацаваны мерапрыемствы па рашучым паляпшэньні ўсёй работы ў калгасах і саўгасах.

Шпаркі тэмп калгаснага будаўніцтва, загортваньне работы па суцэльнай калектывізацыі вёскіх саветаў і раёнаў (Маманавіцкі сельсавет, Клімаўскі, Лоскі, Смалявіцкі раёны і інш.), ён ўзрастаючае імкненьне шырокіх мас бяднякоў - серадняцкіх мас вёскі да калгасаў выклікае ў сваю чаргу абвастрэньне клясавае барацьбы, узмацненьне супраціўленьня кулацтва сацыялістычнай рэканструкцыі вёскі.

Таму перад усімі партыйнымі арганізацыямі в усёй рашучасьцю стаіць пытаньне аб узмацненьні работы на вёсцы, аб узмацненьні кіраўніцтва і паляпшэньні работы ячэек, асабліва саўгасных і калгаскіх, каб забясьпечыць яшчэ больш пасьпяховае разгортваньне калгаснага будаўніцтва і далейшае наступленьне на капіталістычныя элементы.

За час пасьля XII-га зьезду КП(б)В не бяспрэчна дасягнулі некаторага паляпшэньня партыйнай работы ў саўгасах і калгасах, значнага паляпшэньня кіраўніцтва партыйных арганізацый імі калгасным будаўніцтвам, дасягнуты пералом у сэнсе ўваходу камуністых у калгасы.

Так, напрыклад, сетка партыйных ячэек у саўгасах павялічылася з 51 на VII 28 г. да 85 на 1-VII 29 г. і калгасных ячэек з 15 да 40 за гэты-ж самы час. Лік камуністых павялічыўся ў саўгасах з 552 да 870 чал. і ў калгасах — з 144 да 334 чал.

**22 проц. усіх камуністых, што працуюць у сельскай гаспадарцы, ужо знаходзяцца ў калгасах. Аднак, трэба з усёй катэгарычнасьцю заявіць,** што колькасны склад ячэек, вымест работы, тэмп цягненьня ў партыю сельска-гаспадарчых і лясных рабочых і лепшых калгаснікаў, не адпавядае тым запатрабаваньням і задачам, якія на сёньняшні стаіць перад імі.

У сярэднім на адну ячэйку прыпадае ад 3-х саўгасаў і на адзін саўгас толькі 4 партыйцы, прычым палова з іх, бадай, зьяўляюцца служачымі. На адну калгаскую ячэйку прыпадае звыш 10 калгасаў і на адзін калгас не прыпадае нават па адным партыйцы. Вывад ад ліпень зусім відавочны — слаба выконваюцца дырэктывы XII-га зьезду КП(б)В і 16-й партыйнай канфэрэнцыі аб паскарэньні сеткі ячэек і большым уцягваньні ў партыю рабочых саўгасаў і лепшых актывістых - калгаснікаў.

Вось некалькі фактаў, якія пацьвярджаюць паданую думку: па **Мазырскай** акрузе на 1-е ліпеня г. г. была толькі адна калгаская ячэйка, па **Менскай** акрузе з агульнага ліку прынятых за першае паўгодзьдзе ў партыю сяляні, калгаснікі складаюць толькі **6,2 проц.**, а па **Гомельскай** — 7,7 проц.

Далёка яшчэ ня ўсё зроблена па паскарэньні ўваходжаньня ў калгасы камуністых, якія працуюць у сельскай гаспадарцы. Нават пасьля чысткі вясковых ячэек мы сустракаемся з выпадкамі нежаданьня ісьці ў калгас. Чуюцца яшчэ такія разважаньні: **«дайце паўтары гады тэрміну на ўгавор жонкі» (Мазырская акруга)**, «лепш па Сахалін у сасланьне, чым у калгас», «не пайду ў калгас, бо там будзем галадаць» (Гомель) і г. д.

Трэба ў бліжэйшы час дабіцца ўваходу ў калгасы большасьці камуністых-сялян, патрабуючы абавязковага ўваходу пры арганізацыі ў раёне калгасу.

У практычнай-жа рабоце ячэек шмат ёсьць недахопаў. Праўда, ёсьць ужо асобныя ячэйкі, дзе работа пастаўлена добра, дзе яны маюць досыць высокі аўтарытэт і ўплыў ня толькі сярод калгаснікаў, а і сярод ваколічнага насельніцтва, дзе ячэйкі праводзяць вялікую работу па калектывізацыі і арганізацыі новых гаспадарак. Для прыкладу можна прывесьці ячэйку калгасу «Лепінскі шлях», Магілеўскай акругі. Па яе ініцыятыве і пад яе непасрэдным кіраўніцтве арганізаваны калгас у 1.000 гэктараў. Але большасьць ячэек не сканцэнтравала яшчэ сваёй увагі і работы на пытаньні гаспадарчага ўзмацненьня саўгасаў і калгасаў.

Мала зварачаецца ўвагі на зьніжэньне сабекошту прадукцыі, на павышэньне прадукцыйнасьці працы, няма належнага кіраўніцтва работай вытворчых нарад.

Калгаскія ячэйкі надта мала займаюцца пытаньнямі абагульненьня сродкаў вытворчасьці, павялічэньня непадзельных капіталаў, узбуйненьня калгасаў, узмацненьня і паширэньня агрыкультурнага ўплыву на ваколічнае бяднянцка - серадняцкае насельніцтва.

Ячэйкі слаба кіруюць сацыялістычным спаборніцтвам. Зразумела, што адней з галоўнейшых прычын слабой работы ячэек зьяўляецца нізкі палітычны і культурны ўзровень іх, слабая ў мінулым пастаноўка партвыхаваўчай работы, адсюль і выпадкі неразуменьня сутнасьці самакрытыкі, паяўнасьць хваравітых зьявішч у пасобных ячэйках (п'янства, склокі, скрыўленьне клясавай лініі і г. д.).

І, нарэшце, яшчэ адзін буйнейшы недахоп у рабоце ячэек, гэта нездавальняючая пастаноўка работы сярод жанчын, работы дэлегацкіх сходаў, а таксама і масавай.

Нарада распрацуе ряд практычных мерапрыемстваў, якія забясьпечаць ператварэньне саўгаскіх і калгаскіх ячэек у сапраўдныя апорныя пункты ўсяго партыйна - грамадзкага жыцьця ваколічнага насельніцтва.

Вядома, што такімі цэнтрамі ячэйкі могуць стаць толькі тады, калі кіраўніцтва і практычная дапамога ім з боку вышэйшых партыйных органаў будзе поўнасьцю забясьпечана, калі дырэктывы верасьнёўскага пленуму ЦК КП(б)Б і XII-га зьезду будуць выкананы.

**Узмацненьне работы партыйных ячэек у саўгасах і калгасах, паширэньне саткі іх, значна большае ўцягненьне ў партыю сельска - гаспадарчых рабочых і лепшых актывістых - калгаснікаў, асабліва жанчын — ёсьць першачарговая і адна з найгалоўнейшых задач партыйных арганізацый.**

**С. МІЦЬКОЎ.**

## ДАБІЦЦА ПЕРАЛОМУ

(Ячэйка КП(б)Б камуны «Прамень Сацыялізму», Самахвалавіцкі раён, Меншчына)

Ячэйка камуны «Прамень Сацыялізму» існуе ўжо 9 год. Яна арганізавалася разам з самой камунай у 1921 годзе. За гэты час камуна вырасла і ўзмацнілася. Зараз камуна мае свой уласны трактар.

Ячэйка-ж не пасьпявае за ростам камуны. Камуна вырасла і далей расьце, а ячэйка за 9 год існаваньня абсалютна не расла. Цяпер яна налічвае ў сваіх радах толькі 5 чалавек.

У камуне ёсьць кадр для росту, ёсьць таварышы, якія могуць быць у радах партыі. У раёне камуны ёсьць вельмі многа батракоў і беднякоў, якія-б маглі быць уцягнуты ў партыю пры паўнай палітычнай рабоце з боку ячэйкі.

Але ячэйка ніколі не займалася пытаньнямі росту. Ячэйка не выяўляла перадавых, лепшых кадраў сярод членаў камуны і сярод батрацтва і беднаты. Ня гледзячы на рад дырэктыў з боку Самахвалавіцкага райкому КП(б)Б ячэйка ня прымала ніякіх крокаў да ўзмацненьня работы па вярбоўцы ў партыю. І да гэтага часу пытаньне росту не знайшло адбітку ў практычнай рабоце ячэйкі.

Масавай работы сярод членаў камуны ячэйка не вядзе. На ўсю камуну выпісваецца 5 газэт і яны ня чытаюцца ні беспартыйнымі камунарамі, ні партыйцамі. Ячэйка і ўся камуна адарваны ад гаспадарча-палітычнага жыцьця, ад бягучай палітыкі. Прысланая калгассэкцыяй бібліятэка нават не разабрана. Ад кампаніі да кампаніі праводзяцца агульныя сходы членаў камуны, заслухоўваюцца тыя ці іншыя даклады і... у гэтым заключаецца ўся масавая работа сярод камунараў.

У самой ячэйцы асноўныя пастановы партыі не прапрацоўваюцца. Пастановы XV зьезду УсесКП(б), XII-га зьезду КП(б)Б і XVI партканфэрэнцыі не вывучаліся ячэйкай. Члены ячэйкі не разумеюць сутнасьці правага ўхілу і прымірэнцтва да яго. Сакратар ячэйкі вельмі пэсымістычна адносіцца да разьвіцьця камуны і хоча выйсьці з яе. Гэта малавер'е, скэптыцызм ніхто не расцэньвае, як праяву апартунізму, бо ніхто з партыйцаў проста ня ведае сутнасьці і карэньняў правага ўхілу.

Ячэйка адарвана ад масы беспартыйных членаў камун. Досыць сказаць, што большасьць сходаў ячэйкі—закрытыя. Члены партыі не паказваюць прыкладу ў гаспадарчай рабоце і на карыстаюцца аўтарытэтам сярод беспартыйных.

Пытаньнямі калектывізацыі ячэйка не займалася. Наваколь камуны ёсьць шмат бяднянцка-серадняцкіх гаспадарак, якія маглі-б быць уцягнуты ў камуну. Але ячэйка літаральна нічога ня робіць па пашырэньні камуны. Камуна ня робіць агра-культурнай і іншай дапамогі бяднянцкім і серадняцкім гаспадаркам. Камуна замыкаецца ў сябе, бачыць толькі свае інтарэсы.

Сацыялістычнае спаборніцтва ў камуне не праводзіцца. Гэта пытаньне нават не абмяркоўвалася ячэйкай.

Зусім ня дзіва, што ячэйка не расьце. Яна проста не адчуваецца ў камуне, слаба кіруе як гаспадарчым, так і культурным жыцьцём камуны.

У камуне ёсьць і камсамольская ячэйка, якая таксама працуе слаба і ня цікавіцца ростам. Ніякай работы сярод батрацтва камсамольская ячэйка не вядзе. Сярод членаў ЛКСМБ ёсьць некалькі заможных, сераднякоў, такімжа зьяўляецца і сам сакратар ячэйкі.

Ёсьць асобныя выпадкі п'янства і хуліганства сярод камсамольцаў, дысцыпліна ў ячэйцы слабая, культурна-выхаваўчая работа не вядзецца. Камсамольцы ня чытаюць газэт і не арыентуюцца ў элемэнтарных пытаньнях, ня ведаюць асноўных задач партыі і камсамолу.

Самахвалавіцкаму РК КП(б)Б трэба больш цікавіцца работай партыйнай ячэйкі камуны «Прамень Сацыялізму» і дабіцца рашучага пералому, у першую чаргу, у галіне росту ячэйкі.

**КАМУНАР.**

## Ад выпадку да выпадку

(Камуна „Праца", Мазыршчына)

На 130 камун і калгасаў Мазырскае акругі ёсьць толькі адна парт'ячэйка пры камуне «Працы» (Каралішчанскі раён).

Здаецца, што гэтая ячэйка павінна была стаць арганізатарам і прапагандыстым задач партыі па калектывізацыі і сацыялістычным перабудаваньні сельскае гаспадаркі.

На жаль, у практычнай рабоце ячэйкі ёсьць вялікія недахопы.

Культурна-масавая работа заняпала. Ячэйка не займаецца сыстэматычным выхавальнем камунараў. Даклады на гаспадарча-палітычныя тэмы, палітычныя гутаркі і г. д. праводзяцца ад выпадку да выпадку.

Рост ячэйкі зусім слабы. Ячэйка не вярбуе ў партыю новых кадры батракоў і перадавых камунараў-актывістых. Заявы ад прыняцьці ў партыю ляжаць без вырашэньня на 6-8 месяцаў.

**МАЗЫРСКІ.**

## Камсамол працаваў і будзе працаваць пад непасрэдным кіраўніцтвам ленінскай партыі

### Рашучы адпор фракцыйнай барацьбе правай апазыцыі

### Не паслабляць барацьбы з рэшткамі трацкізму і „левымі" загібамі

Пастанова бюро ЦК ЛКСМБ ад 16 кастрычніка 1929 г.

Учора ў «Чырвонай Зьмене» надрукавана пастанова ЦК ЛКСМБ, у якой гаворыцца:

Абгаварыўшы матаэ'ял зьмешчаны ў «Комсомольской Правде» аб адкрытых права-апартуністычных вылазках і фракцыйнай рабоце правых элемэнтаў супроць лініі партыі ў пэрагу камсамольскіх ячэек Масквы на чале з былым сакратаром ЦК УсеЛКСМ **Матвеевым**, Бюро ЦК ЛКСМ з вялікім абурэньнем асуджае гэтыя анты-партыйныя выступленьні і спробы правых зьбіць УсеЛКСМ з правільнай бальшавіцкай лініі і супроцьпаставіць яго ўсёй партыі і старым загартаваным бальшавіцкім кадрам нашае партыі.

Гэтыя антыпартыйныя выступленьні гавораць аб тым, што ня гледзячы на неадпачасовыя папярэджаньні партыяй і на тое, што ўсе панікёрскія сьцьвярджэньні правых даўно ўжо абвергнуты жыцьцём, аб чым найлепш сьведчыць выкананьне з перавышэньнем першага году пяцігодкі; наперакор гэтаму правая апазыцыя ўжо стала на шлях фракцыйнай барацьбы супроць генэральнай лініі партыі і ідзе па шляху былой трацкісцкай і іншых ухілісцкіх апазыцый у сваіх формах барацьбы з партыяй.

Бюро ЦК ЛКСМБ рашуча пратэстуе супроць хлусьлівых ліквідатарскіх заяў Матвеева і інш. аб тым, што «старая гвардыя як рэвалюцыянізуючы фактар сябе зжыла», што старыя кадры «губляюць чуцьцё» і г. д. Такія заявы толькі выкарыстоўваюцца правымі для фракцыйнай барацьбы з партыяй і супроцьпастаўленьне камсамолу партыі.

Бюро ЦК ЛКСМБ упэўнена, што ўвесь Саюз і ЛКСМБ пад цьвёрдым кіраўніцтвам ЦК УсеЛКСМ і партыі цьвёрда і пасьлядоўна разгортваючы ў далейшым рашучую барацьбу з правым ухілам і прымірэнцтвам, як галоўнай небясьпекай сучаснасьці, асабліва з канкрэтнымі праявамі правага апартунізму на практыцы, вядучы неаслабную барацьбу з рэшткамі контр-рэвалюцыйнага трацкізму і «левымі» загібамі, якія зьяўляюцца нічым іншым, як адгалоскамі трацкізму, тыпу Шацкіна, Стэна, Кастрова і г. д., дасьць бязьлітасны адпор усім спробам супроць-паставіць камсамол партыі. **Камсамол працаваў і будзе працаваць пад непасрэдным цьвёрдым кіраўніцтвам нашай ленінскай партыі.** ЦК ЛКСМБ патрабуе прыняцьця самых рашучых ідэёва-арганізацыйных мер у адносінах да тых, хто вядзе фракцыйную работу ў нашых радах.

Бюро ЦК ЛКСМБ цалкам ухваляе пастанову Бюро ЦК УсеЛКСМ аб выпадзе т. Бобрышава са складу членаў бюро ЦК УсеЛКСМ (былога рэдактара «Комсомольской Правды», аслабонёнага ад работы за няпрыхаваньне і спробы абвергнуць палітычную правільнасьць пастаноў Бюро ЦК ад 9-IX аб «К. П.», ухваленых ЦК УсеКП(б), і лічыць, што гэта мера зараз зьяўляецца зусім правільнай і неабходнай, бо той, хто ня хоча зразумець папярэджаньняў, якія рабіліся камсамолам, ня можа быць у кіраўніцтве двухмільённага чырвонаштандарнага камсамолу. Ліст т. Бобрышава ў ЦК, дзе ён поўнасьцю салідарызуецца з пазыцыяй Шацкіна, Стэна, Кастрова і прабуе навязаць камсамолу іх шкодныя погляды, сьведчыць аб усутубленьні памылак.

«Яўна фальшывым і заведама хлусьлівым зьяўляецца сьцьвярджэньне тав. Бобрышава аб тым, што артыкул т. Стэна выходзіў з курсу VI канфэрэнцыі УсеЛКСМ на разгортваньне тэарытычнага руху сярод моладзі і з ленінскіх паказаньняў па крытычным уцямленьні ведаў. Артыкул тав. Стэна, дэкларуючы ў партыі і камсамоле «права на сумненьне і на ўхілы ад партыйнай лініі», расьцкнуты, недавер'ем партыйнаму кіраўніцтву і ня мае нічога агульнага з ленінскім вучэньнем і з пастановамі VI канфэрэнцыі УсеЛКСМ. Размовы аб тым, што неабходна «падвяргаць усё сумненьню, «правяраць на сваім асабістым вопыце», якія вядзе тав. Стэн, у нашых умовах ёсьць размовы супроць ажыцьцяўленьня генэральнай лініі партыі і, зразумела, што будуць падрываць адзінства пэрагаў партыі. Камсамол нікому не дазволіць расхістваць дысцыпліну ў партыі і камсамоле і сеяць у яе пэрагах сумненьне ў правільнасьці генэральнай лініі партыі. ЦК ЛКСМБ ва ўсёй сваёй рашучасьці дасьць рашучы адпор гэтым дробна-буржуазным тэндэнцыям.

Выступленьне тав. Бобрышава па пытаньнях аб пазыцыі Шацкіна і Стэна бязумоўна зьвязана з яго паводзінамі на VI Усесаюзнай канфэрэнцыі, дзе ён прабаваў падмяніць барацьбу з правым ухілам, барацьбой з дзяляцтвам, на што VI канфэрэнцыя, як і ўвесь камсамол да лі рашучы адпор такім спробам.

Мы павінны, праводзячы лёзунг партыі аб барацьбе на два франты, згрупоўваючы асноўны адпор на правым ухіле, як галоўнай небясьпецы сучаснасьці, павінны не паслабляць барацьбы супроць рэштак контр-рэвалюцыйнага трацкізму і «левых» загібаў, выхоўваючы масы камсамольцаў у духу рашучай барацьбы за генэральную лінію партыі.

**Усе сілы на выкананьне пяцігодкі.**

**Няхай жыве цьвёрдае бальшавіцкае ленінскае кіраўніцтва партыі камсамолам! Няхай жыве ленінскі ЦК УсеЛКСМ!**

## За дрэнную падрыхтоўку да чысткі—вымова

(Яч. КП(б)Б Наркамзему)

**На 19 кастрычніка быў прызначаны першы праверачны сход па чыстцы ячэйкі КП(б)Б Наркамзему. Сход меўся пачацца а 7 гадзіне ўвечары, аднак нават да 8 гадзіны зьявілася вельмі мала партыйцаў і яшчэ менш беспартыйных.**

**На час чысткі ячэйкі Наркамзему прымацавана парт'ячэйка Белдзяржбуду, аднак на праверачны сход не зьявіліся ні партыйцы гэтае ячэйкі, ні беспартыйныя рабочыя-будаўнікі.**

**Гэта з усёй навочнасьцю паказвае, як ячэйка КП(б)Б Наркамзему нядбайна аднеслася да падрыхтоўкі да праверкі.**

**Праверачная камісія ВЫНЕСЛА БЮРО ЯЧЭЙКІ КП(б)Б НКЗ ВЫМОВУ за дрэнную падрыхтоўку да чысткі і перанесла сход на 21 кастрычніка.**

**Г.**

## Ударыць па тых, хто скажае клясавую лінію

(Жыткавіцкі раён, Мазырскай акругі)

У разьмеркаваньні крэдыту у **Жыткавіцкім** раёне наглядаецца рад недапушчальных момантаў. У райвыканкоме і сельсаветах няма ніякага вучоту атрыманьня сялянамі крэдыту. Пры разьмеркаваньні крэдыту няма ніякай увязкі ў працы паміж сельска-гаспадарчым т-вам і сельсаветамі. Машыны і жывёла разьмяркоўваліся бяз удзелу сялянскіх камітэтаў узаемадапамогі. Ёсьць факты, калі бядняк, атрымліваючы даведку на атрыманьне с.-г. машыны, і герадаваў гэту даведку кулаку, а апошні атрымліваў машыну. А мясцовыя органы на гэта не рэагавалі. Справа даходзіла нават да спэкуляцыі, так гр. **Лявон**, атрымаўшы ў крэдыт ад с.-г. т-ва каня за 80 руб., тут-жа прадаў яго за 110 руб., і с.-г. т-ва абмежавалася толькі тым, што спагнала датэрмінова належныя 80 руб. Ёсьць выпадкі і цяганіны ў атрыманьні крэдыту. Так, удава **Юлія Раманоўская (Браніслаўскі** сельсавет) 15 раз хадзіла ў **Людзяневіцкае с.-г. т-ва** за 8 вёрст, пакуль не атрымала вызначанага ёй крэдыту. Ёсьць выпадкі атрыманьня крэдыту і кулакамі, асабліва гэта наглядалася ў **Жыткавіцкім** сельсавеце. А ў Браніслаўскім сельсавеце справа дайшла да таго, што прадавалі кулаком бяз ведама сельсавету насеньне для пасеваў, і характэрна, што самыя буйныя крэдыты атрымліваюць кулакі. Так, кулак **Грудніцкі**, які плаціць 156 руб. падатку, атрымаў крэдыт у 300 руб., а заможнік разьмеры, за выключэньнем 2-3 выпадкаў, калі бядняк атрымаў раз 230 руб., а іншыя па 100 руб., а звычайна атрымліваюць па 20, 40 і 50 рублёў. Зварот пазычкі таксама ідзе вельмі туга. Так, адзін селянін, які плаціць 100 руб. падатку, на працягу 5 месяцаў не пагашаў атрыманых ім 42 руб. пазычкі, ні сельсавет, ні с.-г. т-ва меры спагнаньня ня прымалі.

А вось яшчэ характэрны выпадак. цяганіны ў звароце атрыманай пазычкі. Грамадзянін сяла **Людзяневічы** дробны гандляр **Лейхэр** яшчэ **18-VI 1925 г.** атрымаў доўгатэрміновы крэдыт 42 руб. па **19-VI 1927 г.** і вось на судовым загадзе **10-II 1928 г.** апісваецца маемасьць гэтага гандляра, якая складаецца з дому ў 1.000 руб., дробнага тавару і г. д., 24/II 1928 г. гэту вопісь міліцыя прадстаўляе ў с.-г. т-ва для санкцыі на продаж і спагнаньне пазычкі. На гэту вопісь старшыня с.-г. т-ва т Хваенскі кладзе рэзалюцыю: «Устрымацца са складаньнем вопісі да **1-V 1928 г.**, а там відаць будзе», а **25-III 1929 г.** зноў складаецца вопісь маемасьці, дзе ўжо дом паказан коштам у 150 руб., і начальнік міліцыі 9/V 1929 г. кладзе рэзалюцыю—«Вярнуць с.-г. т-ву без выкананьня», а ў с.-г. т-ве гэта вопісь ляжыць да **15 IX 1929 г.** і толькі зараз, пры рэвізіі, выявілася гэта перапіска, якая цягнецца па працягу 2-х год.

Наогул, трэба глыбока праверыць работу крэдытнага т-ва Жыткавіцкага



## Новая перамога на фронце індустрыялізацыі

### На Добрускай фабрыцы пушчана шостая машына

МЕНСК, ЦК КП(б)Б

*(З Добрушу па тэлеграфу).*

**6-я папяровая машына пушчана. Новыя сотні тон паперы пацяклі ў агульны кацёл фабрычнай прадукцыі. Дасягнута новая перамога на фронце прамыслова-гаспадарчага будаўніцтва і сацыялістычнага спаборніцтва.**

**Добруская партарганізацыя з вялікім задавальненьнем паведамляе аб гэтым Цэнтральны Камітэт і разам з ўсёй КП(б)Б, з усёй рабочай клясай падзяляе радасьць з поваду перамогі.**

**Няхай жыве Ленінская камуністычная партыя, пад кіраўніцтвам якой мы будуем сацыялізм.**

**Добрускі райком КП(б)Б.**



6-я папяровая машына ф-кі «Гэрой Працы»

## Адна з буйнейшых фабрык паперы ў СССР

### Устаноўка новай машыны на фабрыцы „Гэрой Працы"

**На Добрускай фабрыцы паперы «Гэрой Працы» Белпапертрэстам пушчана новая шостая машына па вырабе паперы для пісьма. З устаноўкай гэтай машыны Добруская фабрыка стала адной з буйнейшых фабрык паперы ў СССР. Машына выпуская да 40 тон паперы ў суткі, што складае 80—85 проц. выпрацоўкі ўсіх астатніх 5-ці машын. Машына сканструявана нямецкай фірмай паводле апошняга слова тэхнікі.**

**Зараз фабрыка «Гэрой Працы» выпускае да 85 тон паперы ў суткі супроць 48 тон да ўстаноўкі новай машыны. Пры фабрыцы будуецца новы саломеннацэлюлёзны завод.**

### Прывітаньне рабочым Добрускай фабрыкі

Учора прэзыдыум ВСНГ атрымаў з Добрушу наступную тэлеграму: «Машына пушчана, працуе добра».

У зьвязку з пускам новай машыны на фабрыцы «Гэрой Працы» прэзыдыум ВСНГ і Белпапертрэст паслалі ў Добрушу прывітальную тэлеграму.

рабочых, адміністрацыйна - тэхнічны пэрсанал з вялікім посьпехам у галіне індустрыялізацыі БССР з пускам 6-й самачарпалкі. Заклікаем увесь калектыў фабрыкі падвоіць сваю энэргію, каб у найбольш кароткі тэрмін скон-



## Пастанова

### Савету Народных Камісараў БССР

**Аб аслабаненьні акадэміка Ластоўскага, В. У. ад абавязкаў неадменнага сакратара Беларускае Акадэміі Навук і акадэміка Некрашэвіча, С. М. ад абавязкаў віцэ-прэзыдэнта Беларускае Акадэміі Навук**

У зьвязку з тым, што з боку неадменнага сакратара Беларускае Акадэміі Навук акадэміка **Ластоўскага**, Вацлава Ўсьціпавіча, і з боку віцэ-прэзыдэнта Акадэміі акадэміка **Некрашэвіча**, Сьцяпана Міхайлавіча, дапушчана надрукаваньне ў выданьнях Акадэміі Навук раду прац паасобных аўтараў, якія праводзяць у гэтых працах погляды зусім несумяшчальныя з палітыкаю савецкае ўлады, а часамі і погляды варожыя савецкай уладзе і за дапушчэньне надрукаваньня ў выданьнях Акадэміі работы яўнага ворага Савецкай Беларусі Я. Станкевіча, які знаходзіцца за мяжою на службе польскага фашызму і вядзе сыстэматычную актыўную працу супроць савецкай улады, — Савет Народных Камісараў БССР **пастанаўляе:**

1. Прыняць да ведама, што Прэзыдыум Беларускае Акадэміі Навук вынес 11 кастрычніка пастанову, у якой рэзка асудзіў зробленую памылку, прызнаўшы недапушчальным надрукаваньне ў выданьнях Акадэміі працы ворага Савецкай Беларусі Я. Станкевіча, і правільна падкрэсьліў ролю і задачы Савецкай Акадэміі, як акадэміі пралетарскае дзяржавы.

2. Аслабаніць акадэміка **Ластоўскага**, Вацлава Ўсьціпавіча, ад абавязкаў неадменнага сакратара Беларускае Акадэміі Навук і акадэміка **Некрашэвіча**, Сьцяпана Міхайлавіча, ад абавязкаў віцэ-прэзыдэнта Акадэміі.

3. Даручыць Беларускай Акадэміі Навук зрабіць дадатковыя выбары новых асоб па паказаныя пасады і падаць пасьля выбараў адпаведныя кандыдатуры на зацьвярджэньне Савету Народных Камісараў, згодна існуючага палажэньня аб Беларускай Акадэміі Навук.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР **М. ГАЛАДЗЕД.**

Нам. кіраўніка спраў Савету Народных Камісараў і Эканамічнай Нарады БССР **Л. ДУБАВІЦКІ.**

16 кастрычніка 1929 г.

г. Менск.

## Аб падрыхтоўцы новых навуковых кадраў

Задача падрыхтоўкі новых навуковых працаўнікоў зьяўляецца ў сучасны момант самай неадкладнай і самай ударнай задачай.

Як праводзіцца набор асьпірантаў? Да гэтага часу кандыдатаў у асьпіранты высоўвала і фактычна праводзіла прафэсура. Партыйныя і прафэсыянальныя арганізацыі прымалі вельмі слабы ўдзел у падборы асьпірантаў.

Хто ішоў у асьпіранты? Часта ішлі ў асьпіранты тыя, што цураліся, будучы ў мурох ВНУ, грамадзкай працы, а таксама тыя, якія па сканчэньні ВНУ не хацелі ехаць на працу ў вёску. Усё гэта не магло не адбіцца адмоўна як на сацыяльным складзе, так і на ідэалёгічнай устойлівасьці асьпірантаў.

У гэтым годзе НКА паслаў абежнік аб арганізацыі пры вышэйшых навучальных установах адборачных камісій, якія павінны заняцца падборам кандыдатаў у асьпіранты, але чамусьці гэтыя камісіі да апошняга часу не распачалі сваёй працы, і падбор асьпірантаў для навукова-дасьледчых устаноў у гэтым годзе амаль што сарваны, бо студэнты гэтага выпуску ўжо разьмеркаваны на працу. Трэба рабіць падбор асьпірантаў яшчэ да выпускаў у ВНУ.

Другое ня менш важнае пытаньне—гэта пытаньне **аб падрыхтоўцы і выхаваньні асьпірантаў.**

Да гэтага часу існуе такі парадак. Паўны кіраўнік складае праграму падрыхтоўкі. Гэта праграма разглядаецца ў адпаведнай камісіі, і толькі. Прэзыдыум праўленьня ВНУ стаіць у баку; праграмы, у сваёй большасьці, марксыцка-нявытрыманыя.

Навуковая праца асьпірантаў ні на якіх пасяджэньнях не заслухоўваецца, акрамя прафэсара, які кіруе працаю асьпіранта. Такая саматужная падрыхтоўка нічога, акрамя шкоды, для пралетарскай дзяржавы ня дасьць.

У сельска-гаспадарчай акадэміі прафэсура рыхтуе сабе зьмену, так, каб яе нічому не навучыць.

Асьпірант акадэміі Юрашкевіч (па повіч) зьбіраўся ехаць у Прагу «абараняць сваю дыплёмку», каб атрымаць залаты мэдаль.

Гэтыя факты гавораць нам аб тым, што справа з падрыхтоўкай асьпірантаў стаіць у нас вельмі і вельмі дрэнна.

**Нашыя асьпіранты працуюць у вельмі дрэнных умовах.** Празьмерная грамадзкая нагрузка (асабліва асьпірантаў-камуністых )не дае магчымасьці займацца вельмі значных недахопаў, якія характарызуюць зусім нездавальняючае кіраўніцтва НКАсьветы школьным выхаваньнем, асабліва ў гэтых установах НКАсьветы ёсьць рад выпадкаў непэдагагічных мэтэдаў выхаваньня і выкладаньня ў школах, грубыя адносіны і меры фізычнага ўпліву на вучняў, адрыў ад грамадзкіх прац, нацыяналдэмакратычныя, шавіністычныя настрої і інш. зьявішчы, зусім нецярпімыя ў савецкай школе і якія зьяўляюцца перажыткамі мэтэдаў выхаваньня старой буржуазнай школы; слабая пастаноўка выхаваўчай працы, калі галоўная ўвага зьвярталася на ўсваеньне фармальных ведаў, зусім слабое разгортваньне самакрытыкі як работы кіруючых органаў, так і работы саміх устаноў, выпадкі замазваньня недахопаў і кругавой парукі. Прычым нездавальняючае кіраўніцтва НКАсьветы яшчэ больш падкрэсьліваецца тым, што большасьць недапушчальных скажэньняў была выяўлена паміма НКАсьветы, на аснове заяў у органы РСІ і выкрыцьцяў у друку. Органы НКАсьветы да гэтага часу не наладзілі належнага, сыстэматычнага, жывога кіраўніцтва ўсімі галінамі работы, жыцьця культасьветных устаноў, часта праводзячы дзяляцкую, прымірэнчую лінію барацьбы з паасобнымі недахопамі бо нават імкнучыся замазваць клясавыя скажэньні ў рабоце школ.

Нездавальняючая дзейнасьць НКАсьветы ў барацьбе з недахопамі і скажэньнямі клясавае лініі ў школьным выхаваньні прыводзіла на мясцох да недаацэнкі значэньня сацыялістычнага выхаваньня дзяцей, як адпэй з форм клясавай барацьбы з варожай рабочай клясе кулацкай буржуазнай ідэалёгіяй. Ва ўмовах абвастраньня клясавае барацьбы і наступленьня на капіталістычныя элемэнты ў краіне, калі ў школе праваднікам супраціўленьня капіталістычных элемэнтаў зьяўляецца невялічкая частка настаўніцтва, яўна і таемна варожага дыктатуры пралетарыяту, з якою неабходна весьці самую рашучую барацьбу як сіламі шырокай савецкай грамадзкасьці, таксама і ў першую чаргу самому настаўніцтву, якое павінна ачышчаць свае рады ад варожага элемэнту,—адсутнасьць або слабасьць барацьбы з дробна-буржуазнай ідэалёгіяй у школе прыводзіць да паслабленьня пазыцый нашай партыі сярод значных пластоў настаўніцтва, актыўна адданага савецкай уладзе, якое актыўна вядзе барацьбу за ідэалёгію рабочае клясы і за лінію партыі, і тым самым узмацняе ўплыў варожай часткі на частку хісткага настаўніцтва, у той-жа час, калі за лепшую частку хісткіх павінна весьціся барацьба за іх пераход на пазыцыі ажыцьцяўленьня ідэалёгіі рабочай клясы, шляхам рашучага ачышчэньня школы ад варожых элемэнтаў.

Такое ідэалёгічнае становішча і існуючыя недахопы савецкае школы зьяўляюцца ня толькі вынікам слабога кіраўніцтва органаў НКАсьветы, але і вынікам слабога і нездавальняючага кіраўніцтва парт., праф. і камсамольскіх арганізацый і такога, што вакол культасьветных цэнтравана ўвага рабочых мас і шырокай савецкай грамадзкасьці. У выніку гэтага замест выкананьня дырэктыў партыі аб рашучай барацьбе з элемэнтамі дробна-буржуазнай ідэалёгіі ў школе, перш за ўсё сіламі асноўнага пласта адданага савецкай уладзе настаўніцтва, за апошні час наглядаецца недапушчальнае і безадказнае абагуленьне абвінавачаньня ўсяго настаўніцтва ў нелёйльнасьці да савецкае ўлады і яго рэакцыйнасьці.

Бюро ЦК, разгледзеўшы пастановы ніцтва школьнай справай з боку НКАсьветы, Дар. адда. асьветы МБВ чыгункі і акруговых партыйных і праф. органаў, абавязвае апошнія прыняць тэрміновыя меры па ажыўленьні недахопаў у школьным выхаваньні, выкліканых нездавальняючым кіраўніцтвам органаў НКАсьветы; у гэтых мэтах Бюро ЦК лічыць неабходным паставіць даклад НКАсьветы аб становішчы народнае асьветы ў БССР на бліжэйшым пленуме ЦК КП(б)Б.

Бюро ЦК прымае да ведама пастановы ЦКК-РСІ аб мерах узьдзейнічаньня ў адносінах органаў і асоб, вінаватых у створаным становішчы ў Аршанскай 9-цігадовай школе, асабліва адносна акруговай РСІ, парт. і праф. органаў, якія дапусьцілі нядбайныя адносіны ў пытаньні ўхіленьня недахопаў школы, адсутнасьць якой-бы там ні было праверкі прад'яўленых групе настаўніцтва абвінавачаньняў, безадказнае штэмпэляваньне неправераных абвінавачаньняў, месьніцкую ўпартасьць і нежаданьне прызнаць свае памылкі ў гэтай справе. Бюро ЦК з свайго боку ставіць у віну Аршанскаму АК няпрыняцьце ім мер да правільнага вырашэньня справы і ўпартае нежаданьне прыняць да выкананьня зусім правільныя прапановы ЦКК-РСІ.

Бюро ЦК, разгледзеўшы пастановы прэзыдыуму ЦКК па гэтым пытаньні, толькі ў выніку вынесеных пастаноў Аршанскага АК аб прызнаньні ім сваёй віны і памылковасьці паводзін адносна паст

# КАЛГАСЫ І САЎГАСЫ ДА 1 ЛІСТАПАДА ПАВІННЫ ЗДАЦЬ УСЕ ХЛЕБНЫЯ ЛІШКІ

## Работу па мабілізацыі складаў і тары весьці пабаявому

## КУЛАК ЗАТРЫМЛІВАЕ ЖЫТА І ПШАНІЦУ І ЗДАЕ, ЗАМЕСТ ГЭТАГА, КАРМАВЫЯ КУЛЬТУРЫ. ВЫКРЫЕМ КУЛАЦКІЯ МАНЭУРЫ

## Затрыманьне здачы хлеба калгасамі павінна разглядацца, як шкодніцтва

### Кіраўніка калгасу „Праца" прыцягнуць да суровай адказнасьці

Калгасы Беларусі павінны былі да 1-га кастрычніка здаць 3.300 тон таварных лішкаў збожжавых культур. Аднак, яны здалі 103,2 тоны. Такім чынам, верасьнеўскі плян хлебазагатовак калгасамі быў выкананы толькі на 31,2 проц., па жыце на 65-70 проц.

Што паслужыла прычынай зрыву верасьнёўскага пляну? Папершае--ня ўсе калгасы скончылі малаціць жыта. Малаціць ярыну толькі яшчэ пачалі. Падругое, шмат часу было патрачана на асеньнія с.-г. работы—уборку бульбы

С.-г. каапэрацыя спазьнілася в падлікам хлеба ў калгасах, дый цяпер яна ўлічвае поўнасьцю хлеба калгасаў, асабліва аб'яднаньняў — машынных і мэліярацыйных таварыстваў. Амаль зусім не падлічаны хлеб, здадны калгасамі спажыў-каапэрацыі і Саюзхлебу. Гэта паказвае што да апошняга часу справа з улікам здачы калгаснага хлеба пастаўлена дрэнна.

Толькі тыдзень таму назад пры Белкалгассаюзе адбылася нарада старшынь акркалгассаюзаў. На нарадзе старшыні акркалгассаюзаў запэўнілі, што ў касрычніку хлебазагатоўкі будуць ісьці значна лепш, чым у верасьні, і што да 1-га лістапада плян хлебазагатовак будзе выкананы калгасамі на ўсе 100 проц. Але старшыні калгасаў забыліся пра свае абяцаньні. Да апошняга часу пералому ў хлебазагатоўках не адчуваецца.

Акругі зусім не даюць вестак бходзе хлебазагатовак на 10-га кастрычніка. На 15-га кастрычніка атрыманы весткі ад Менскай і Віцебскай округ. Па гэтых вестках за дзесяцідзёўку ўсімі калгасамі Меншчыны здана ўсяго толькі 14 тон, а калгасамі Віцебшчыны—3,5 тоны збожжа. Ці ўлічваліся тут чырвоныя абозы, якія арганізоўваліся калгасамі —нам невядома.

Як абстаіць справа з хлебазагатоўкамі ў калгасах па асобных раёнах Менскай акругі? Для прыкладу возьмем Сьмілавіцкі і Лагойскі раёны. Хлебазагатоўкамі ў калгасах там амаль ніхто ня цікавіўся. Ніхто не растлумачваў калгасам, што своячасовае і поўнае выкананьне імі сваіх абавязкаў перад дзяржавай —гэта экзамен ўсёй калгассыстэмы на яе гаспадарчую і палітычную сьпеласьць. Вось чаму калгасы «Новы Шлях», «Зялёны Прамень» і інш. (Лагойскага раёну) яшчэ і не прыступалі да здачы таварных лішкаў збожжа.

Ня лепш справа і ў калгасах Сьмілавіцкага раёну. Калгас «Вылучанец» павінен здаць 40 цэнтнэраў збожжа, а здаў толькі 14, калгас «Праца» павінен здаць 51 цэнтнэр, а здаў толькі 6,1 цэнт., пры гэтым здаў..., ня жыта, а авёс, ды яшчэ засьмечаны на 30 проц.

Камуна імя Фрунзэ, якая павінна здаць 1,94 цэнт., таксама далёка ня выканала пляну хлебазагатовак. Аб тым, колькі павінны калгасы здаць лішкаў ярыны, крэдытнае таварыства нічога ня ведае.

Калі так будзе ісьці справа з хлебазагатоўкамі і далей, дык кастрычнікаўскі плян будзе сарваны таксама, як і верасьнёўскі.

Трэба, каб раённыя арганізацыі правялі вялікую настойлівасьць у справе здачы хлеба калгасамі.

Зацяжка ў прывядзеньні збожжа ў кандыцыйную годнасьць, затрыманьне са здачай таварных лішкаў, таксама, як і продаж на прыватны рынак, павінны разглядаца, як шкодніцтва.

КАЛГАСЬНІК.

## Калгасам „Прамень сацыялізму" і „Працавітасьць" забаронена выдача крэдытаў за сувязь з прыватнікам

Некаторыя з работнікаў калгасаў яшчэ ня досыць зразумелі значэньня своячасовай здачы хлебных лішкаў дзяржаве.

Так, напрыклад, у калгасе «Чырвоная Зорка» (Барысаўшчына) разважаюць так: «са здачаю хлеба яшчэ пасьпеем, усё роўна прыватніку не павязем». Такія разважаньні толькі карысны клясаваму ворагу.

Пры праверцы ходу хлебазагатовак Калгассаюз устанавіў, што некаторыя калгасы не парвалі сувязі з прыватнікам. Так, калгасы «Прамень сацыялізму» (Самахвалавіцкага раёну) і «Працавітасьць» (прыгарадная мяжа) прадалі па дзьве каровы прыватніку, а калгас «Працавітасьць» прадаваў пшаніцу кулаку.

За сувязь з прыватнікам Калгассаюз абвясьціў суровую вымову саветам гэтых калгасаў, забараніўшы выдачу крэдытаў калгасу «Прамень сацыялізму» на працягу 6 месяцаў, а арцелі «Працавітасьць» прапанавана датэрмінова ўнесьці 1.000 рублёў крэдыту.

У дзень калектывізацыі ў Астрашыцкім гарадку сяляне здалі дзяржаве 700 п. хлеба
На здымку чырвоны абоз

## Кулацтва затрымлівае здачу жыта і пшаніцы

### ЗАМЕСТ ГЭТАГА ЯНО ЗДАЕ АВЁС І ВІКУ

У некаторых акругах Беларусі кулакі і заможныя сяляне імкнуцца ашукаць хлебазагатоўчыя арганізацыі і здаюць менш каштоўныя культуры (авёс і віку), затрымліваючы жыта і пшаніцу для продажу па спэкуляцыйных цэнах на прыватным рынку.

Трэба сказаць, што месцы ня ўсё яшчэ зрабілі для таго, каб зжыць гэта небясьпечнае становішча. Зусім ня ўлічваецца, што ўмовы ўраджаю гэтага году дапускаюць рэзкае павялічэньне часткі жыта і пшаніцы ў агульным пляне затвакае збожжавых культур. Цьвёрдае заданьне, данае кулаку, не дасягае мэты, калі ён выконвае гэта заданьне ня тымі культурамі, якія нам патрэбны.

Ёсьць яшчэ адна акалічнасьць, якая прымушае тэрмінова паставіць пытаньне аб павялічэньні часткі жыта і пшаніцы ў пляне загатовак.

**Нашы рэсурсы дэфіцытных тавараў па прэміраваньні хлебазагатовак абмежаваны і пры масавым паступленьні аўсу спачатку кампаніі ёсьць небясьпечна нерацыянальнага выдатканьня гэтых тавараў.**

Месцы павінны прымаць самыя рашучыя меры і строга сачыць за тым, каб кулацка-заможныя пласты ў асноўным выканалі загатоўку за лік тых культур, што нам патрэбны.

## ДАМО АДПОР КУЛАЦКІМ ВЫСТУПЛЕНЬНЯМ СУПРОЦЬ ВЯСКОВЫХ АКТЫВІСТЫХ

МАГІЛЕЎ. (Наш. кар.). Правядзеньне хлебазагатовак па Магілёўскай акрузе адначасецца рэзкім абвастрэньнем клясавае барацьбы на вёсцы. Кулацтва ня толькі вядзе агітацыю супроць здачы хлеба, але становіцца на шлях тэрору ў адносінах да бядняцка-серадняцкіх мас вёскі.

Так, у Прапойскім раёне 8 кастрычніка падкулачнікі зрабілі замах на забойства старшыні Гайнынскага сельсавету, Васількова. Кулакі стрэлілі ў вакно хаты старшыні, які ў той час знаходзіўся дома. Здрадніцкая куля праляцела міма. Але кулакі на гэтым не супакоіліся і ўвечары падпалілі гумно старшыні. Згарэла ўсё збожжа. Кулакі адпомсьцілася Васількову за тое, што ён актыўна вёў працу па хлебазагатоўках і змагаўся з кулацтвам, якое затрымлівае здачу лішкаў хлеба.

Другі выпадак. Некалькі дзён таму назад кулак Зэлікаў з хутара Рыжкаўка, Быхаўскага раёну, зрабіў напад на бедняка Барысэвіча, члена сельсавету, за тое, што Барысэвіч праводзіў працу па арганізацыі чырвонага абозу.

Ня менш абураючы выпадак меў месца ў Баханскім сельсавеце, Журавіцкага раёну, дзе кулакі зрабілі замах на члена сельсавету бедняка Гаўрыленка, які варочаўся дадому з суседняй вёскі, дзе ён праводзіў сход аб хлебазагатоўках. У яго таксама стрэлілі з адрэзу. Але і тут замах ворага ня ўдаўся.

У вёсцы Хадунь, Клімавіцкага раёну, на сход беднаты, дзе абмяркоўвалася пытаньне хлебазагатовак, нейкім чынам пралез падкулачнік Сталяроў Арцём і пачаў пагражаць беднаце: «Я здам 7 пудоў хлеба,—заявіў ён,—але двум чалавекам не пашанцуе».

Аналёгічны выпадак меў месца ў мястэчку Хоцімску.

Бедната дае кулацкім вылазкам рашучы адпор.

Так, у вёсцы Шасьцёраўка, Клімавіцкага раёну, на сход сялян, прысьвечаны хлебазагатоўкам, зьявіўся кулак Трагубаў і выступіў супроць арганізацыі чырвонага абозу. Трагубаў заявіў, што ў яго няма ніякіх лішкаў. Бедната, бачачы нахабную хлусьню кулака і ведаючы, што ў яго ёсьць вялікія лішкі, якія ён хавае да вясны, каб прадаць па 8-9 рублёў, пастанавіла абавязаць яго здаць 100 пудоў збожжа і прадставіць агульнаму сходу сялян квіток ад загатоўчых органаў.

Такі самы выпадак меў месца і ў вёсцы Кавалёўка гэтага раёну, дзе кулак Ягоранка таксама не хацеў здаць лішкаў, але і тут бедната вынесла належную пастанову—аблажыць яго ў 100 пудоў збожжа.

## Рабочыя брыгады выехалі ў вёскі Аршаншчыны

ВОРША. (Наш кар.). Для дапамогі хлебазагатоўкам прафсаюзы Аршаншчыны вылучылі чатыры рабочыя брыгады. Брыгады накіроўваюцца ў Круглянскі, Талачынскі і Амсьціслаўскі раёны, дзе вельмі слаба пастаўлена работа па хлебазагатоўках.

Фабрыка «Дняпрэўская мануфактура» Дубровенскага раёну.

Але ня ўсе мясцовыя прафэсыянальныя арганізацыі зразумелі важнасьць хлебазагатоўчай кампаніі. Так, напрыклад, чыгуначнікі, харчавікі і гарбары доўгі час тармазілі вылучэньне рабочых брыгад для хлебазагатовак, адмаўляючыся тым, што ў іх ня было каго пасылаць.

## МАБІЛІЗАВАЦЬ УСЕ ГОДНЫЯ СКЛАДЫ І ТАРУ

### СІЛАМІ САВЕЦКАЙ ГРАМАДЗКАСЬЦІ ПЕРАМОЖАМ ТЭХНІЧНЫЯ ТРУДНАСЬЦІ У СПРАВЕ ХЛЕБАЗАГАТОВАК

Усесаюзная ўрадавая камісія па забесьпячэньні хлебазагатовак складамі і па рэгуляваньні хлебных перавозак і Наркамгандлю СССР зьвярнуліся з адозваю да ўсіх выканкомаў, гаспадарчых, дзяржаўных і каапэрацыйных устаноў, да ўсіх грамадзкіх арганізацый і грамадзян Саюзу ССР.

У адозьве адзначана, што тэхніка хлебнага гандлю значна адстае ад тых тэмпаў хлебазагатовак, якія разгорнуты ў часе хлебазагатоўчай кампаніі ў гэтым годзе. Недахват складаў, тары і інш. тэхнічных сродкаў перашкаджае разгортваньню хлебазагатовак.

Усе савецкія, каапэрацыйныя і грамадзкія арганізацыі павінны дапамагчы хлебазагатоўшчыкам у мабілізацыі складаў, мяшкоў і брэзэнтаў.

Урадовая камісія і Наркамгандлю заклікаюць усе арганізацыі СССР аддаць самую сур'ёзную ўвагу мабілізацыі складачных памяшканьняў і тары.

Усе памяшканьні, якія пустуюць або скарыстоўваюцца няматэзгодна, пад склады, усе вольныя мяшкі і брэзэнты, дзе-б яны не знаходзіліся, павінны быць пераданы Саюзхлебу, на які ўскладзена ўся адказнасьць за разьмеркаваньне хлеба ў краіне.

Асаблівую ролю ў мабілізацыі складаў і тары павінны адыграць камсамольскія арганізацыі, якія праз мясцовыя органы і лёгкую кавалерыю могуць выявіць запасы тары ў асобных арганізацыях, выявіць склады, няматэзгодна занятыя іншымі таварамі.

Разам з савецкімі і каапэрацыйнымі арганізацыямі кожны грамадзянін Саюзу ССР павінен адгукнуцца на заклік камісіі і здаць мяшкі, якія ёсьць у яго за ўстаноўленую плату хлебазагатоўшчыкам.

Урадовая камісія і Наркамгандлю ўскладаюць на Саюзхлеб праз яго мясцовыя канторы, арганізацыю прыёму мяшкоў ад насельніцтва і разьлікі са здатчыкамі. Атрыманыя мяшкі павінны быць неадкладна накіраваны ў раёны хлебазагатовак.

НА ЗДЫМКУ: піянэр са сьцягам піянэрарганізацыі на пярэднім возе чырвонага абозу. (Вёска Запалье, раён Рагачову)

Сьвядомыя адносіны савецкай грамадзкасьці, кожнага грамадзяніна СССР да дапамогі хлебазагатоўкам дадуць магчымасьць перамагчы тэхнічныя затрудненьні і выканаць да студзеня гадавы плян хлебазагатовак.

## 1½ МІЛЬЁНЫ РУБЛЕЎ, НЯ ВЕРНУТЫХ С.-Г. КРЭДЫТАЎ

### С.-г. крэдыты часта трапляюць у рукі клясавага ворага

### Злачынныя адносіны працаўнікоў крэдыттаварыстваў да спагнаньня пазычак

Савецкая ўлада і партыя ўзялі рашучы курс на сацыялістычную перабудову сельскае гаспадаркі.

Па ўсёй лініі сельскае гаспадаркі ідзе рашучая ломка старых адсталых форм гаспадараньня і замена іх сацыялістычнымі формамі, адбываецца рэзкае клясавае распластаваньне вёскі, разгортваецца клясавая барацьба.

У гэтай рабоце і ў гэтай барацьбе ролю аднаго з важнейшых вагароў павінен адыграць сельска-гаспадарчы крэдыт.

Важнейшай задачай сыстэмы сельска-гаспадарчага крэдыту зьяўляецца мабілізацыя сродкаў насельніцтва і іх пераразьмеркаваньне. Між тым, разьмеры ў сыстэме сел.-гас. крэдыту сродкаў насельніцтва зусім нязначныя. Белсельбанку на бягучы год было дана заданьне прыцягнуць сродкі насельніцтва ў суме адзін мільён пяцьсот тысяч рублёў і паказан рад спосабаў іх прыцягненьня (мэтавыя ўклады і інш.). Ня гледзячы на ўсё гэта, за бягучы год нізавой сеткай прыцягнута вельмі мала ўкладаў.

**Значная частка сельска-гаспадарчых крэдытных таварыстваў да гэтага часу яшчэ ня вызвалілася ад уплыву кулацкіх элемэнтаў і не ўзяла цьвёрдага курсу на калектывізацыю, на ўздым бядняцка-серадняцкіх мас. на тэхнічную перабудову сельскае гаспадаркі.**

Пазычкі часта трапляюць у рукі кулакоў і ўтвораных імі іллжэ-калгасаў і іллжэ-каапэратываў.

Так, напрыклад, у Сьмілавіцкім раёне, Менскай акругі, былі выкрыты такія зьявы, калі ўласьнік смалярнага заводу з'арганізаваў іллжэ-мэліярацыйнае таварыства з сваіх рабочых і дабіўся крэдыту на зыкарчоўку карчоў для сваёй смалярні. У Чэрвенскім раёне група кулакоў таксама з'арганізавала іллжэ-мэліярацыйнае таварыства, атрымала пазыку на 2.052 руб., якую падзяліла паміж сабою.

Пазычкі часта выдаюцца асобам, якія не займаюцца зусім сельскай гаспадаркай, або скарыстоўваюцца пазычальнікамі не па прызначэньні. Так, напрыклад, у Горацкім сельска-гаспадарчым крэдытным таварыстве пазычкі выдаваліся на значныя сумы навуковым працаўніком сельска-гаспадарчай акадэміі, студэнтам, фатографу, былому жандарму, які не займаецца сельскай гаспадаркай, народным судзьдзям, працаўніком райвыканкому і г. д. У Талачынскім с.-г. крэдытным таварыстве, Аршанскае акругі, і ў Асіпавіцкім сельска-гаспадарчым крэдытным т-ве, Бабруйскае акругі, крэдыты выдаваліся служачым чыгуначнай станцыі, настаўнікам, служачым РВК і розным іншым асобам, якія не займаюцца сельскай гаспадаркай. У выніку сродкі сыстэмы с.-г. крэдыту ня прыносяць патрэбнай карысьці справе разьвіцьця і перабудаваньня сельскае гаспадаркі.

Найвялікшай шкодай у працы с.-г. крэдытных таварыстваў зьяўляецца надзвычайна шырокае папырэньне пратэрмінаваньня пазык, якія выводзяць са звароту сыстэмы с.-г. крэдыту вялізарныя сродкі, што пазбаўляе значныя масы бядняцка-серадняцкага сялянства крэдытнай дапамогі і зрывае выкананьне пляну сацыялістычнага перабудаваньня сельскай гаспадаркі.

Агульная сума пратэрмінаваных пазычак на пачатковай сетцы ў гэты час складае, прыкладна, каля паўтара мільёнаў рублёў і мае тэндэнцыю да далейшага павялічэньня.

У выніку—бядняцка-серадняцкія масы, калектыўныя гаспадаркі і вытворчыя аб'яднаньні недаатрымліваюць па БССР паўтара мільёна руб. пазычак і пазбаўляюцца многіх тысяч с.-г. машын. Пляны крэдытаваньня сельскай гаспадаркі зрываюцца.

Сярод такіх гаспадарак, якія маюць даўгі, ёсьць і калектыўныя гаспадаркі; ёсьць выпадкі, калі яны ўхіляюцца ад выплаты пазычак нават і тады, калі маюць значныя запасы пераэлізаванай яшчэ таварнай прадукцыі.

Такія адносіны асобных калгасаў да сваіх абавязкаў зьяўляюцца асабліва недапушчальнымі, бо яны дыскрэдытуюць увесь калгасны рух.

Мясцовыя органы і ў першую чаргу самі-ж сельска-гаспадарчыя крэдытныя таварыствы праяўляюць зусім недапушчальныя фармальныя адносіны да работы па барацьбе з пратэрмінаваньнямі пазык. Так, напрыклад, у горацкім с.-г. крэдытным т-ве члены праўленьня ні разу ня выехалі ў вёску для правядзеньня канкрэтнай працы па спагнаньні пратэрмінаваных пазычак. У Чарэйскім таварыстве праўленьне нічога не рабіла па спагнаньні пратэрмінаваных пазык, пратэрмінаваньні дасягнулі сумы да 30.000 руб., многія абавязацельствы нават страцілі сваю моц па прычыне даўнасьці.

Крэдытныя таварыствы часта наймаюць судовых выканаўцаў і міліцыянераў і даручаюць ім усю справу збору пазычак. Яны ўхіляюцца ад гэтай справы і лічаць сябе вольнымі ад якой небудзь адказнасьці за яе.

Некаторыя сельска-гаспадарчыя крэдытныя т-вы зусім не зварачаюць належнае ўвагі на датэрміновае спагнаньне пазык з кулакоў, іллжэкалтасаў, іллжэ-каапэратываў, асоб, якія не займаюцца сельскай гаспадаркай.

Нарэшце, с.-г. крэдытныя т-вы зусім не вядуць агітацыйнай работы на карысьць добраахвотнага датэрміновага пагашэньня пазык.

Такога становішча далей цярпець нельга. Пры такіх умовах сельска-гаспадарчы крэдыт у значнай меры выпадае з ліку тых магутных фактараў сацыялістычнага перабудаваньня сельскае гаспадаркі, у радзе якіх ён павінен займаць ганаровае месца.

Усе сельска-гаспадарчыя крэдытныя таварыствы павінны цьвёрда стаць на шлях, вызначаны дырэктывай партыі і ўраду.

ЛАСТОЎСКІ.

## 600.000 руб. сялянскіх укладаў у ашчадныя касы

### У першым квартале БССР павінна выканаць гэта заданьне

Яшчэ два гады таму назад касы ашчаднасьці БССР не рабілі належнага ўплыву на нашы агульныя гаспадарчыя пляны. З таго часу касы ашчаднасьці значна ўзмацніліся. Яны абярнуліся ў важную крыніцу, якая харчуе сродкамі народную гаспадарку і дапамагае індустрыялізацыі краіны. Зьберажэньні, якія асядаюць у ашчадных касах, прадстаўляюць ужо салідны капітал. За 1928-29 апэрацыйны год ашчадныя касы БССР уцягнулі ў рэчышча дзяржкрэдыту звыш 5 млн. руб. і на 1/X 29 г. рэшткі ўкладаў у ашчадных касах БССР складае суму больш за 12 млн. руб. пры 250.000 укладчыках.

Агульны тэмп росту народнае гаспадаркі прад'яўляе ашчадным касам усё большыя патрабаваньні. Зацьверджаныя ўрадам кантрольныя лічбы па ашчаднай справе на новы гаспадарчы год прадугледжваюць уцягненьне ў ашчадныя касы 6 млн. руб. і 140 тысяч новых укладчыкаў. Цэнтр цяжкасьці пераносіцца на сялянскія ўклады і, такім чынам, канцэнтруецца дзейнасьць ашчадных кас на сяле, г. зн. на тым вучастку, які да гэтага часу зьяўляецца найбольш слабым у сэнсе ахопу зьберажэньняў. Кантрольныя лічбы гэтага году намячаюць цьвёрдыя тэрміны прыліву ўкладаў. У гэтых адносінах мае асаблівае значэньне бягучы першы квартал. Згодна заданьня Саюзнага Ўраду, у першым квартале павінна быць выканана 40 проц. заданьня па сялянскім сэктары. Для БССР гэта складае 600.000 руб.

Гэта важнае заданьне ўскладае на ашчадныя касы вялізарную работу і вялізарную адказнасьць. Асабліва важна максымальна скарыстаць першы квартал, які найбольш спрыяе ўцягненьню сялянскіх зьберажэньняў. Невыкананьне заданьня ў першым квартале можа стварыць пагрозу для гадавога пляну цалкам.

У той-жа час бясспрэчна, што выкананьне квартальнага пляну па сялянскім сэктары зьвязана з вялікімі труднасьцямі. Ашчадны апарат сваімі сіламі ня справіцца з гэтай справай. Кампанія на прыцягненьні сялянскіх укладаў павінна праводзіцца зараз у вёсцы сіламі ўсяго савецкага апарату і грамадзкасьці.

Кантрольныя лічбы па ашчадных касах даведзены да раёнаў і сельсаветаў. Кожны раён, кожны сельсавет павінен безадкладна праверыць, што канкрэтна ад яго патрабуе заданьне ўраду на гэты квартал і безадкладна ўзяцца за выкананьне яго. Трэба максымальна актывізаваць нізавую сетку ашчадных кас і забясьпечыць ёй спрыяючыя ўмовы для работы. Трэба мабілізаваць усю мясцовую сельскую грамадзкасьць для прапаганды і папулярызацыі ашчадных кас.

Асабліва важная работа камісій па садзейнічаньні дзяржкрэдыту. Дзейнасьць іх за гэты пэрыяд павінна быць асабліва актыўнай. Цэнтральная камісія садзейнічаньня пры ЦВК Саюзу ўскладзіла на камісіі садзейнічаньня вялікую практычную работу па выкананьні квартальнага заданьня.

Практыка дзейнасьці ашчадных кас зазначае, што, ня гледзячы на ўсе труднасьці, мы маем магчымасьць пры мабілізацыі ўвагі нашай савецкай і грамадзкай сыстэмы скарыстаць ашчадныя касы для выпашэньня чарговых фінансавых задач. Не павінна быць ніякага сумненьня, што і на гэты раз заданьне ўраду будзе выканана.

Першы квартал павінен даць праз касы ашчаднасьці БССР 600.000 руб. сялянскіх укладаў і да выпашэньня гэтай баявой задачы трэба безадкладна прыступіць.

П.

## Нядбайныя адносіны да дэмабілізаваных чырвонаармейцаў

ВОРША. (Наш. кар.). У Воршы прымаюць вельмі нядбайна дэмабілізаваных чырвонаармейцаў і ніяк ня рыхтуюцца, каб іх сустрэць.

Аршанская біржа працы зусім не падрыхтавалася да прыёму дэмабілізаваных. Яна нават ня ўлічыла ўсіх тых месц і пасад, якія вызваляюцца ў сувязі з прызывам у Чырвоную армію моладзі 1907 году нараджэньня.

Гэтым годзе чамусьці не стварылі. Дэмабілізаваныя не атрымліваюць ніякае дапамогі. Нават ім не даюць дармовых абедаў у сталоўцы. Пры мне акрвакіраваны званіў па тэлефону на біржу працы, ці будуць яны даваць дэмабілізаваным квіткі на дармовыя абеды, як гэта рабілася раней. Яму адказалі коратка і ясна: «Будзем даваць квіткі зімой. Цяпер яшчэ — не». Я думаў, што людзі лася, што гэта іменна так. Гэта значыць, што біржа працы будзе даваць дармовыя талёны на абеды толькі тады, калі дэмабілізацыя ўжо скончыцца і калі дэмабілізаваныя ўжо будуць на працы. Няма таксама і інтэрнату, дзе можна было-б дэмабілізаванаму чырвонаармейцу пераначаваць.

Можна сказаць, што ў Воршы — поўнае невыкананьне дырэктыў аб дапамо-

# Аршанскія чыгуначнікі пакончаць са шкоднікамі

## Асноўная маса цягавікоў і пуцейцаў за 8-мігадзіннае дзяжурства

## Як пратэст супроць вылазкі клясавага ворага, аршанскія чыгуначнікі абяцаюць у падарунак 12-й гадавіне Кастрычніка новы паравоз

Апублікаваная ў «Зьвязьдзе» інфармацыя аб трывожных зьявішчах на Аршанскім вузьле ўсхвалявала ўсю чыгуначную масу. Многія рабочыя да атрыманьня «Зьвязды» ня ведалі аб тым, што робіцца на лініі. Што датычыць мясцовых арганізацый, у прыватнасьці Аршанскага вучкпрафсожу, дык, як «Зьвязда» паведамляла ўжо, яны аказаліся вельмі блізарукімі, каб разабрацца ў падзеях на чыгунцы, і не мабілізавалі грамадзкае ўвагі супроць штодзённых аварый і паломак. Да паводзін гэтых арганізацый прыдзецца яшчэ вярнуцца, калі мы атрымаем больш падрабязныя весткі аб выніках расьсьледваньня фактаў шкодніцтва.

Сёньня-ж, па падставе інфармацыі старшыні Белбюро ЦК саюзу чыгуначнікаў т. Ісаева, мы можам паведаміць наступнае.

У апошнія дні на Аршанскім вузьле адбылося некалькі агульных сходаў рабочых. У сваіх выступленьнях рабочыя рэзка асудзілі факты аварый і паломак і патрабавалі хутчэйшага іх расьсьледваньня і выяўленьня вінаватых.

Усе выступаўшыя закрапалі пытаньне аб пераходзе з 12-цігадзіннага дзяжурства па 8-мігадзіннае, ухвалілі гэта мерапрыемства, зазначаючы па дарэмную страту рабочага часу пры 12-цігадзінным дзяжурстве, на вялікую колькасьць няшчасных выпадкаў з людзьмі, на труднасьці арганізацыі культурнага абслугоўваньня рабочых і г. д.

Як пратэст супроць вылазкі клясавага ворага, аршанскія чыгуначнікі пастанавілі ў па-занормавы час, пасьля работы, пабудаваць паравоз з электрычным асьвятленьнем і пусьціць яго першым маршрутам у Масиву з цягніком хлеба для чырвонай сталіцы. Скончэньне пабудовы паравоза аршанскія чыгуначнікі парашылі прыстасаваць да 12-й гадавіны Кастрычніка.

У сваіх рэзалюцыях аршанскія чыгуначнікі абяцаюць узмацніць сваю пільнасьць і прыняць усе захады, каб у далейшым падобныя аварыі і паломкі, якія мелі месца на Аршанскім вузьле, не паўтараліся.

Усе гэтыя пастановы аршанскіх чыгуначнікаў гавораць аб тым, што «Зьвязда» не памылілася, выказваючы ўпэўненасьць, што аршанскія чыгуначнікі дадуць на руках усім тым, хто адважыцца перашкаджаць савецкай краіне будаваць сацыялізм.

Сваім Кастрычнікаўскім падарункам аршанскія чыгуначнікі панесьлі моцны ўдар усім кулацкім элемэнтам, усім абываталям і ворагам рабочае клясы, лішні раз паказаўшы сваю сьвядомасьць і адданасьць сваёй рабочай дзяржаве.

П—и.

## Рабочым Аршанскага чыгуначнага вузла

### Адкрыты ліст ад 1.000 рабочых будаўнікоў Унівэрсытэцкага гарадка і Дому Ураду

ДАРАГІЯ ТАВАРЫШЫ!

З мэтар'ялаў цэнтральнага органу нашай партыі «Зьвязда» нам стала вядома аб аварыях, фактах шкодніцтва на Аршанскім чыгуначным вузле.

Глыбока абураючыся паказанымі фактамі шкодніцтва, расцэньваючы іх, як спробы клясавага ворага сарваць нашае пасьпяховае сацыялістычнае будаўніцтва, мы лічым неабходным з асаблівай сілай падкрэсьліць тое, што падзеі на Аршанскім чыгуначным вузле паказваюць, што клясаваму ворагу часамі ўдаецца падпарадкаваць свайму ўплыву асобныя адсталыя элемэнты ў рабочай клясе, зьвязаныя з дробна-буржуазным кулацкім асяродзішчам, і праз іх рабіць сваю ігідную шкодніцную справу.

Клясавы вораг з посьпехам ажыцьцяўляе свой уплыў іменна там, дзе нашы грамадзкія арганізацыі працуюць слаба, дзе няма належнай рашучай барацьбы і адпору кулацкім, дробна-буржуазным і іншым чужым рабочай кляса настроям.

Факты шкодніцтва, якія мелі месца на Аршанскім чыгуначным вузьле, нельга разглядаць ня ў сувязі з тэй агульнай пастаноўкай, у якой працякае ўсё нашае сацыялістычнае будаўніцтва, гэта ёсьць вылазка клясавага ворага, які вядзе барацьбу з усёй рабочай клясай па ўсім фронце будаўніцтва.

Мы ўпэўнены, што асноўная маса рабочых-чыгуначнікаў Воршы, як і ўся рабочая кляса, вельмі добра ўяўляюць абставіны нашай барацьбы і будаўніцтва.

Рабочая кляса ў саюзе з асноўнымі масамі сялянства, пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі, праводзіць напружаную работу па сацыялістычнай перабудове нашай краіны. Рабочая кляса, як гаспадар краіны, адважна перамагае ўсе труднасьці, зьвязаныя з асаблівасьцямі нашага гаспадарчага становішча і праяўляе нячуваную ініцыятыву, энэргію і энтузіязм ва ўсім нашым будаўніцтве.

Іменна ў выніку гэтага энтузіязму самімі рабочымі высунуты і ажыцьцяўляецца ленінскі мэтад сацыялістычнага спаборніцтва ва ўсёй нашай штодзённай рабоце. Іменна таму мы закончылі з перавышэньнем першы год пяцігодкі і ставім перад сабою вялікую, але рэальную задачу—выканаць пяцігодку за 4 гады, наперакор ныцікам і людзям, якія ня вераць у сілу рабочае клясы.

Зусім зразумела, што гэтыя нашы посьпехі ня могуць не выклікаць шалёнага супраціўленьня клясавага ворага, які ў посьпехах сацыялістычнага будаўніцтва справядліва бачыць сваю пагібель.

Вось выходзячы з чаго мы, рабочыя будаўнікі унівэрсытэцкага гарадка, зьвяртаемся да вас, пралетараў-чыгуначнікаў Аршанскага вузла з заклікам павесьці самую рашучую, жорсткую барацьбу з клясавым ворагам, яго дапаможцамі і агентамі, некаторыя з якіх прытаіліся ў нашым асяродзішчы і прыкрываюцца назваю рабочага.

Трэба вакол меўшых месца на вузьле фактаў стварыць шырокую грамадзкую думку рабочых, жалезнай рукой зьнішчыць усякую магчымасьць праяўленьня такіх фактаў у далейшым. Для саміх-жа шкоднікаў мы патрабуем суровай кары ад нашага пралетарскага суду.

Неабходна ў шмат раз узмацніць увагу і пралетарскую пільнасьць кожнага рабочага да ўсяго клясава-чужога ў нашым асяродзішчы, разгарнуць шырокую выхаваўчую работу сярод рабочых, узброіўшы кожнага з іх супроць усякіх хваравітых настрояў, якія прасочваюцца да нас з чужой клясы.

Неабходна зьвярнуць асаблівую ўвагу на сацыялістычную вытворчую дысцыпліну на вузьле, на правядзеньне ў жыцьцё мэтадаў сацыялістычнага спаборніцтва і разгортваньне сьмелай пралетарскай самакрытыкі, ня гледзячы на асобы. Выкананьне гэтых задач зьяўляецца лепшым сродкам узбраеньня рабочых супроць клясавага ворага.

Мы ўпэўнены, што рабочыя Аршанскага чыгуначнага вузла, як і ўся рабочая кляса, будуць весьці барацьбу супроць спробы асобных адсталых элемэнтаў у рабочай клясе падмяніць інтарэсы клясы інтарэсамі асобных груп. Сучасны момант патрабуе арганізаванасьці рабочае клясы, пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі, у барацьбе супроць клясавага ворага, за ажыцьцяўленьне ўсіх мерапрыемстваў, зьвязаных з ажыцьцяўленьнем пяцігадовага пляну сацыялістычнага будаўніцтва.

З упэўненасьцю, што вы, рабочыя Аршанскага вузла, пасьпяхова справіцеся з труднасьцямі, якія стаяць перад вамі, у сувязі з выкрытымі фактамі шкодніцтва, мы просім вас у бліжэйшы пэрыяд час ад часу асьвяціць у нашай «Зьвязьдзе», як вы змагаецеся і перамагаеце гэтыя труднасьці, выконваючы задачы сацыялістычнага будаўніцтва.

З брацкім прывітаньнем:
РАБОЧЫЯ БУДАЎНІКІ УНІВЭРСЫТЭЦКАГА ГАРАДКА І ДОМУ УРАДУ.

## Узмацніць палітыка-выхаваўчую работу

Пазаўчора ў вагонных майстэрнях МББ чыгункі (станцыя Менск) адбыўся лятучы мітынг па пытаньні аб падзеях на ст. Ворша. Ва ўхваленай аднагалосна рэзалюцыі рабочыя вагонных майстэрань адзначылі, што здарэньні ў Воршы і рад іншых фактаў на транспарце сьведчаць, між іншым, аб невыстарчальнай палітвыхаваўчай рабоце з боку саюзных органаў.

Рабочыя заклікаюць аршанскіх чыгуначнікаў сканцэнтраваць усю сваю ўвагу на больш пасьпяховым выкананьні пяцігодкі, якая забясьпечыць паляпшэньне эканамічнага і культурна-бытавога стану рабочае клясы.

Сход прапанаваў саюзным органам узмацніць палітвыхаваўчую работу сярод членаў саюзу і выявіць сацыяльны стан саюзных радоў.

Сход патрабуе тэрміновага расьсьледваньня здарэньняў у Воршы і суровага

## Шкоднікі прыцягнуты да адказнасьці

ВОРША. (Па тэлеф. ад наш. кар.). ДПУ ст. Орша скончыла папярэдняе сьледзтва па справе аб шкодніцтве на Аршанскім вузьле чыгункі. Сьледзтва выявіла наяўнасьць шкодніцтва. Арыштаваны два чалавекі: машыніст і яго памбоцнік. Справа перадана Аршанскай акруговай пракуратуры.

Створана камісія з прадстаўнікоў акругкому КП(б)Б, акрпрафбюро, дарпрафсожу, Белбюро ЦК чыгункі і партколектыву вузла. Камісія ставіць перад сабою задачу—выявіць характар і прычыны аварыі, выявіць, як рэагавалі партыйныя і прафэсыянальныя арганізацыі, сацыяльны твар канкрэтных віноўнікаў аварыі, мабілізаваць увагу рабочых вакол пытаньня аб шкодніцтве на чыгунцы.

На вузьле адбыліся сходы рабочых службы цягі, руху, пуці, мясцкому ст. Воршы Заходняя. На ўсіх сходах рабочыя асудзілі дзейнасьць шкоднікаў і патрабавалі тэрміновага расьсьледваньня справы і суровага пакараньня вінаватых.

Рабочыя дэпо пастанавілі, у адказ на вылазку клясав

# Што робіцца на тэрыторыі Усебеларускай выстаўкі

## ЖЫВАЯ ДЫЯГРАМА Ў НАТУРЫ.—ЖЫТНЯ-ПШАНІЧНЫЯ ГІБРЫДЫ.—ГАДАВАЛЬНІК ЛЕКАВЫХ РАСЬЛІН

### Акругі і раёны нічога ня робяць для падрыхтоўкі да выстаўкі.—Рабочыя арганізацыі ў баку

На тэрыторыі Усебеларускай выстаўкі сельскай гаспадаркі і прамысловасьці распачалося будаўніцтва 21 павільёну для разьмяшчэньня экспанатаў па сельскай гаспадарцы.

Яшчэ вясною гэтага году на тэрыторыі выстаўкі было закладзена 18 вучасткаў з шматпалёвымі севазваротамі, якія пакажуць дасягненьні па сельскай гаспадарцы нашых саўгасаў і калгасаў, а таксама паасобных раёнаў БССР. Севазвароты на выстаўцы будуць уяўляць сабою жывую дыяграму ў натуры. Кожная акруга, прадстаўнік кожнага эканамічнага раёну БССР знойдзе сваю групу севазваротаў на выстаўцы. Гэтыя севазвароты будуць прадстаўляць цікавасьць для агранамаў, вясьмельных працаўнікоў наогул і, асабліва, для працаўнікоў па сацыялістычным земляробстве.

На выстаўцы падрыхтавана глеба пад яравыя і гародніну. Лошыцкая станцыя Усесаюзнага інстытуту прыкладной батанікі на тэрыторыі выстаўкі засвае новыя збожжавыя культуры, Віцебская дасьледчая станцыя — гародніну. **Жытня-пшанічныя гібрыды, якія будуць пасеяны на тэрыторыі выстаўкі, даюць у 2-3 разы большы ўраджай, у параўнаньні з звычайным жытам і пшаніцаю.**

Магілеўская станцыя лекавых расьлін вызначае для сябе на выстаўцы дзялянку ў 500 кв. мэтраў для закладкі гадавальніка лекавых расьлін. На плошчы ў 6 гэкт. насаджана 349 пладовых дрэў, матар'ял для гэтага ўзяты ў с.-г. акадэміі, Лошыцы, з Глівенскага садовага гадавальніку.

На тэрыторыю выстаўкі ўжо завезена да 1.000 пудоў перагною і 10 тысяч пудоў торфу. Загатоўлена шмат куч перагною і дзярніны для кампосту пад кветкі.

Наогул, работы на падрыхтоўцы і вызначэньні тэрыторыі выстаўкі ўжо скончаны.

Зусім горш стаіць справа з падрыхтоўкаю выстаўкі ў акругах. З-за перагружанасьці працаю акруговых агранамаў усе заданьні галоўвыстаўкому **на мясцох не разглядаюцца. Ніводная акруга да апошняга часу ня мае акруговага пляну па падрыхтоўцы да выстаўкі. Раёны таксама нічога канкрэтнага ня робяць.**

**Наогул, трэба адзначыць, што грамадзкая думка вакол выстаўкі да гэтага часу яшчэ не мабілізавана. Рабочыя арганізацыі недаацэньваюць сваёй ролі ў арганізацыі выстаўкі, лічачы яе справай выключна сельска - гаспадарчых органаў.** Ня гледзячы на тое, што Калгассаюз даў канкрэтныя заданьні, што трэба рыхтаваць да выстаўкі, па лініі калгассаюзу нічога канкрэтнага ў гэтым напрамку яшчэ ня зроблена.

Загадчыкі аддзелаў на выстаўцы яшчэ і сёньня ня досыць зразумелі, што яны адказваюць за своечасовае выкананьне вызначаных для іх заданьняў. Тое самае трэба сказаць і адносна загадчыкаў пададдзелаў. Яшчэ да гэтага часу не разасланы ўсе інструкцыі і каляндарныя пляны аб выстаўцы на месцы.

Для паляпшэньня падрыхтоўчай работы да выстаўкі трэба паставіць даклады загадчыкаў аддзеламі і пад'аддзеламі аб праробленай імі працы, а таксама наладзіць выезды ў акругі і раёны для жывога інструктаваньня месц аб падрыхтоўцы да выстаўкі.

Слаба асьвятляецца падрыхтоўчая работа да выстаўкі **і ў нашым друку.** Друк і зараз яшчэ поўнасьцю не скарыстоўваецца для папулярызацыі выстаўкі сярод шырокіх працоўных мас Беларусі. У акруговых газэтах **было зьмешчана ня больш 2-3 артыкулаў на гэту тэму.** Наша рабселькораўская армія таксама мала ўдзельнічае ў гэтай рабоце. Беларускія часопісі, як «Наш Край», «Шлях Калектывізацыі», «Асьвета», «Мэдычная Думка», «Савецкае Будаўніцтва» і інш., ня гледзячы на тое, што яны маюць на выстаўцы свае аддзелы і, здавалася-б, павінны арганічна быць зьвязаны з выстаўкай, **да апошняга часу не зьмясьцілі ніводнага артыкулу аб падрыхтоўцы да Усебеларускай с.-г. выстаўкі.** Між тым, друк зьяўляецца найлепшым агітатарам і папулярызатарам гэтай вельмі важнай справы ў нашым сацыялістычным будаўніцтве.

**П. СЯРГЕЙЧЫК.**

---

СЁНЬНЯ, 20 кастрычніка, у памяшканьні клюбу друкароў (Ленінская, 20), а 7 гадз. увечары адбудзецца

**АГУЛЬНА-ГАРАДЗКАЯ НАРАДА ЧЛЕНАЎ РЭДКАЛЕГІЙ НАСЬЦЕНГАЗЭТ І РАБКОРАЎ НАСЬЦЕННЫХ І ЦЭНТРАЛЬНЫХ ДРУКАВАНЫХ ГАЗЭТ**

)—) ПАРАДАК ДНЯ )—(

перавыбары рэдкалегій насьценгазэт і задачы рабкораў—даклад пам. заг. АПАД ЦК КП(б)Б тав. Будзінскага

—) Пасьля нарады КІНО (—

Мен. АК КП(б)Б і рэд. газ. „Зьвязда"

---

**АПА ячэек і ўпоўнаважаныя газ. „Зьвязда"**

Кастрычнікавы райком КП(б)Б СКЛІКАЕ СЁНЬНЯ, 20 кастрычніка, а 6 гадз. увечары

**НАРАДУ**

**АПА ЯЧЭЕК І УПОЎНАВАЖАНЫХ „ЗЬВЯЗДЫ"**

Нарада адбудзецца ў памяшканьні АПА райкому

Яўка абавязкова і без спазьненьня

Райком КП(б)Б

---

# Рэагуюць на заметкі праз 9-12 месяцаў

## Забыліся аб пастанове ЦКК КП(б)Б

Рэагаваньне на рабселькораўскія заметкі, якія зьмяшчаюцца і якія пасылаюцца рэдакцыяй на рассьледваньне, пастаўлена зусім дрэнна. Савецкія, прафэсыянальныя і іншыя арганізацыі не адчуваюць адказнасьці за несваячасовае рэагаваньне на заметкі. Друкуецца заметка ў газэце аб злоўжываньнях, аб безгаспадарчасьці ў якім-небудзь прадпрыемстве. Але... рэагуюць на такую заметку праз 4-5 месяцаў, а то і больш. Ня прымаюцца з боку належных установаў своячасовыя меры да зьнішчэньня тых ці іншых недахопаў. Горш яшчэ стаіць справа з рэагаваньнем на заметкі, якія пасылаюцца на рассьледваньне. Мы маем цэлы рад фактаў, калі на заметкі не адказваюць гадамі і больш.

Вось некалькі фактаў. Яшчэ ў студзені месяцы гэтага году рэдакцыя паслала на рассьледваньне заметку «Рука руку мые» **Халопеніцкаму РВК** для рассьледваньня і прыняцьця належных мер. Адказу рэдакцыя не атрымала. Між іншым, у заметцы пісалася, што лясьнічы **Трус** Краснадуцкага лясьніцтва прымайстраваў на працу па знаёмстве свайго цесьця.

Другі факт. У **Азарыцкім раёне** настаўнік Мароз карыстаўся кавалкам зямлі ў 13,75 дзес. Рэдакцыя атрымала адказ ад Азарыцкай раённай зямельнай камісіі, што ад Мароза зямля адабрана, пакінута яму толькі 0,75 дзесяціны. Пастанова райзямкамісіі абскаржана Марозам у акруговую зямельную камісію. Але абяцаных вынікаў рэдакцыя не атрымала. А ўжо прайшло дзевяць месяцаў.

Гэты факт кажа аб тым, як зямельныя органы несваячасова рэагуюць на заметкі, займаюцца цяганінай і інш.

Падамо яшчэ рад бюракратычных адносін да справы рэагаваньня на заметкі. Так, **Сьмілавіцкаму РВК** паслана заметка яшчэ з студзеня за № 1164/р аб тым, што старшыня **Рудзенскага сельсавету дрэнна адносіцца да сялянства. Вынікаў рассьледваньня** ўсё-ж не атрымана.

Несваячасова рэагуюць на заметкі рабселькораў некаторыя акруговыя кантрольныя органы. Яшчэ ў студзені месяцы за № 1180/р паслана заметка ў **Магілеўскую РСІ** для рассьледваньня і прыняцьця мер. У заметцы пісалася, што **старшыня Альховік заматаў дзяржаўныя сродкі.** Факт крымінальнага характару, але... прайшло дзевяць месяцаў, а вынікаў ніякіх. Магчыма, што гэты самы Альховік і зараз злоўжывае дзяржаўнымі сродкамі.

**Полацкая РСІ** да апошняга часу не адказала на заметку «Там, дзе парушаецца клясавая лінія», якая паслана 23 студзеня за № 1202/р. У заметцы пісалася, што **Хоцінскае сельска-гаспадарчае крэдытнае таварыства абслугоўвае заможнікаў.** Факт вялікай важнасьці. Патрэбна было-б тэрмінова рассьледаваць і вінаватых прыцягнуць да адказнасьці. Але РСІ ўсё яшчэ маўчыць.

Прафэсыянальныя арганізацыі таксама бюракратычна адносяцца да рэагаваньня на заметкі. Заметку «Зьдзекі над батраком Смаляром» рэдакцыя паслала на рассьледваньне **Бярэзінскаму райкому саюзу сельска-гаспадарчых рабочых** яшчэ ў студзені месяцы. Адказу няма.

Пастанова ЦКК КП(б)Б ад 15 студзеня 1929 году аб узмацненьні рэагаваньня на крытыку ў друку і насьценгазэтах кажа вось што:

«Абавязаць усіх кіраўнікоў устаноў і прадпрыемстваў прыняць рашучыя меры да больш хуткага рэагаваньня і пасылкі адказаў на рабселькораўскія заметкі... Па заметках, якія патрабуюць мерапрыемстваў у адміністрацыйным парадку даваць адказ **на працягу ня больш тыдню з моманту зьмяшчэньня ці атрыманьня заметкі.** Па заметках, якія патрабуюць расьсьледваньня на мясцох (па пэрыфэрыі) таксама даваць больш хуткія адказы, ва ўсякім выпадку **на працягу ня больш 2-3 тыдняў.**

У гэтых мэтах цэнтральным і акруговым установам трэба як мага скарачаць колькасьць перадатачных інстанцый, а ў больш важных выпадках — праводзіць жывое расьсьледваньне».

Гэтай пастановай мы яшчэ лішні раз напамінаем установам як цэнтральным, так і акруговым аб неабходным і своячасовым рэагаваньні на рабселькораўскія заметкі.

**Ул. Б.**

---

# Ад'езд тав. Галадзеда

Учора выехаў у Маскву па бюджэтных справах старшыня СНК БССР тав. Галадзед. Тав. Галадзед прабудзе ў Маскве некалькі дзён.

---

# У дзень 12-гадавіны Кастрычніка будзе пушчана новая фабрыка запалак

**Усе работы па пабудове новай фабрыкі запалак «Чырвоная Бярэзіна» ў Барысаве скончаны. Зараз канчаецца мантаж абсталяваньня. У бліжэйшыя дні адбудзецца спробны пуск фабрыкі. Урачысты пуск фабрыкі ў эксплёатацыю намечаны ў дні 12-ай гадавіны Кастрычнікавай рэвалюцыі.**

**Фабрыка абсталявана па тыпе лепшых фабрык запалак Эўропы і поўнасьцю мэханізавана. Частка абсталяваньня, якая дагэтуль увозілася для фабрык запалак з-за граніцы, зроблена на савецкім заводзе «Мэтал» у Рыбінску. На фабрыцы будзе ўведзены 7-гадзінны рабочы дзень і бесьперапынная вытворчасьць. На трох зьменах будзе занята каля 1.000 рабочых.**

**Фабрыка выпусьціць 840 тыс. скрынак запалак у год на суму па продажных цэнах да 10 мільёнаў руб. Значная частка прадукцыі пойдзе на экспарт.**

---

# Забойства трамвайнага рабочага Карабчова

Клюб будаўнікоў перапоўнены. Менскі акруговы суд на працягу трох дзён разглядаў у паказальным парадку справу аб забойстве трамвайнага рабочага Карабчова.

На лаўцы падсудных рабочыя-будаўнікі **Адамец** 22 год і **Меранкаў**—27.

Акалічнасьці гэтае справы вельмі простыя. 3-га верасьня падсудныя, запрасіўшы рабочага **Карабчова** «ўспрыняць» атрыманую пэнсію, накіраваліся ў піўную. Добра выпіўшы, усе трое вярнуліся дадому. На Стара-Слабодзкай вул. бяз усякай прычыны падсудныя напалі на свайго таварыша **Карабчова** і адабралі ў яго 65 руб. Потым **Меранкаў** пачаў душыць Карабчова, а Адамец біў яго камянем па галаве.

Труп Карабчова быў знойдзены на вуліцы ў лужы крыві. Ня гледзячы на яўныя довады, на паказаньні сьведак, якія чулі праз вакно размовы забойцаў, апошнія нагла не прызнавалі сваёй віны, адмовіліся ад паказаньняў на папярэднім следзьце, блыталіся і хлусілі.

Але судовае следзьтва лёгка вывяла іх на чыстую ваду.

У справе фігуруе калектыўная заява рабочых будаўнікоў, якія патрабавалі расстрэлу забойцаў.

Менскі акруговы суд прызнаў злачынства па 247«в» арт. КК—даказаным (узброены разбой, зроблены групаю асоб) і прыгаварыў **Адамца** да 9 год пазбаўленьня волі, а **Меранкава**—да расстрэлу.

Грамадзянскі іск жонкі забітага **Карабчова** перададзены для вырашэньня ў грамадзянскі суд.

---


С 1-го НОЯБРЯ ГАЗЕТА „ПРАВДА" ПЕРЕХОДИТ НА НЕПРЕРЫВНЫЙ ВЫПУСК ВО ВСЕ ДНИ НЕДЕЛИ

Все подписчики за прежнюю подписную плату (1 р. в м-ц) получат 30-31 номер вместо прежних 24-25.

СПЕШИТЕ ПОДПИСАТЬСЯ на НОЯБРЬ и ДЕКАБРЬ.

ПОДПИСКА ПРИНИМАЕТСЯ: Белорусским отдел. „ПРАВДА" Минск, Советская, 61, тел. № 8-21; Гомельским п/отдел. „ПРАВДА" Гомель, Кооперативная, 12, тел. № 1-94; Витебским п/отдел. „ПРАВДА" Витебск, Ленинская, 11, тел. № 96

и штатными сотрудниками отделения и под'отделений, снабженными соответствующими удостоверениями, а также всеми газетными отделами почтово-телеграфных контор в стенах своих контор и газето-письмоносцами на квартирах подписчиков.

На периферии в местах отсутствия наших под'отделений подписка принимается всеми почтово-телеграфными конторами.


---

# Тэатр і кіно

## Першы адкрыты сымфанічны канцэрт аркестру Белрадыёцэнтру

За апошні час у гор. Менску адчуваецца вялікая патрэба ў сталых сымфанічных канцэртах, каб даць магчымасьць кожнаму працоўнаму паслухаць добрую, сур'ёзную музыку. З гэтай мэтай Белрадыёцэнтр і наладжвае першы сымфанічны канцэрт у панядзелак 21 кастрычніка ў Белдзяржтэатры. Беларускі радыёцэнтр мае сталы сыграны аркестр у 35 асоб, а для адкрытых канцэртаў да яго дадаецца яшчэ 15 чал. кваліфікаваных музыкаў.

У праграму першага канцэрту ўваходзяць наступныя рэчы: сымфанічная паэма «Шэхэразада», музыка Рымска-Корсакава (першы раз у Менску) «Рококо»—музыка Чайкоўскага ў выкананьні віолёнчэлістага Арлова, «Ліс Тацьцяны» з оп. «Евгений Онегин» у выкананьні артысткі Несьцярэнкі і аркестровая сюита з балету «Лебядзіное возера», дырыжыруе А. Бясьсьмертны.

---

## ПАВЕДАМЛЕНЬНІ

**КУРСЫ РАЦЫЯНАЛІЗАТАРАЎ.**—Сёньня (нядзеля 20 кастрычніка), роўна а 6 гадзіне ўвечары адбудуцца заняткі, на якіх павінны прысутнічаць усе слухачы адміністрацыйнай, тэхнічнай і вытворчай групы. Заняткі адбудуцца ў памяшканьні інстытуту аховы працы (рог вул. Энгельса і Карла Маркса, № 44-23).

**ПЭДГАБІНЭТ.**—З 15-га кастрычніка г. г. пэдгабінэт Менскага акруговага інспэктарыяту народнай асьветы перайшоў на бесьперапынны тыдзень. Час працы—6—10 гадзін штодня.

**21-га кастрычніка** а 7-й гадзіне ўвечары першы сход **сэкцыі палітэхнічнай асьветы.**

Парадак дня: 1. Задачы палітэхнічнай асьветы (дак. тав. Панкевіч).

2. Арганізацыйныя пытаньні.

Яўка настаўнікаў, якія запісаліся ў сэкцыі, абавязкова.

**ДОМ АСЬВЕТЫ.**—Сёньня кіно «Сьнегазвал». Пачатак а 8 і 10 гадзін. Зьвыш праграмы выступае артыстка Л. Броўн.

**Панядзелак**—кіно «Шчасьлівыя кольцы». Пачатак 8—10 гадзін.

21-га кастрычніка, а 6 гадзіне ў вялікай залі пэдтэхнікуму акрсавет таварыства «ІПН» склікае нараду ўсіх настаўнікаў школ прыгараднага сельсавету і загадчыкаў школ гораду Менску для абгаварэньня пытаньня аб арганізацыі лікпунктаў у прыгарадным сельсавеце, арганізацыі ячэйкі «ІПН», правядзеньні месячніку і г. д.

АПА Менакругкому КП(б)Б паведамляе, што ў панядзелак, 21-X—29 г., а 8-й гадзіне ўвечары ў памяшканьні 2-й сямігодкі (Ленінская,—21, супроць пошты) выклікаюцца апоргі ячэек КП(б)Б па пытаньні працы вячэрняй саўпартшколы.

22 кастрычніка а 7 гадзіне ўвечары ў памяшканьні клюбу «Чырвоны Будаўнік» адбудзецца аб'яднаны адчынены сход ячэек КП(б)Б саюзу будаўнікоў, Белдартрансу і Аўтакіраўніцтва з наступнай абвесткай дня:

1. Даклад аб становішчы і рабоце Белдартрансу.

2. Садакład аб становішчы і рабоце Менакрдарадзеду.

На сход запрашаюцца ўсе рабочыя і служачыя памяніёных арганізацый.

Яўка членаў і кандыдатаў КП(б)Б абавязкова.

---

Адказны рэдактар ЯН. АСЬМОЎ.

---


Белдзяржкіно і мэтадычнае бюро Акрана

даводзіць да ведама ўсіх членаў пэдагагічна-мэтадычнага савету дзіцячага кіно „ЮНЫ ПІЯНЭР"

т. т.: Сабалеўскага, Шаенака, Колчыца, Якабсона, Губера, Ксенжука, Шпілевіча, Турэцкай, Александровіча, Далідчыка, Фрыдмана, Гучко і Мазура, што

СЁНЬНЯ, 20 КАСТРЫЧНІКА,

а 7 г. увеч. ў памяшканьні Белдзяржкіно (Рэвалюц. 4, уваход са двара)

— СКЛІКАЕЦЦА —

ЧАРГОВАЕ ПАСЯДЖЭНЬНЕ САВЕТУ

Парадак дня: 1) канструяваньне савету, 2) аб статуце пэд.-маст. савету, 3) аб парадку прагляду карцін, 4) аб рэпэртуары кіно.

Запрашаюцца прадстаўнікі друку і ЦК ЛКСМБ

Белдзяржкіно і мэтадычн. бюро Акрана.

Дзяржаўны Яўрэйскі Тэатр БССР

Пядзеля, 20 кастрычніка

„Берглюсы"

ГЛУХІ

драма ў 3-х дзеях, 4 карцінах

Спэктакль для фабкому 1-й друкарні. Пачатак роўна а 8 з пал. г. увеч. Астача білетаў у касе тэатру.

КІНО-ТЭАТР КУЛЬТУРА

Мастацкі фільм СТАРОЕ І НОВАЕ

— ЗВЫШ ПРАГРАМЫ — КІНО-ХРОНІКА САЎКІНО № 43 і інфармацыя Белдзяржкіно ТРАМВАЙ ПАШОЎ

КІНО ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ

Амэрыканскі фільм НАНУК у 6-ці частках. Звыш праграмы: хроніка Саўкіно № 49. Пачатак 1 сэансу а 7 г. Каса—ад 5 г.

КІНО ПРАЛЕТАРЫ

Новы амэрыканскі фільм СТАРАЯ № 99 Арыгінальная камэдыя ў 6 частках. Звыш праграмы: кіно-хроніка Саўкіно № 53 Пачатак сэансаў а 7 з пал. г. Каса—ад 6 г.

Адна з лепшых карцін сусьветнай кінэматаграфіі ЧАНГ (Жахі джунгляў) у 6 частках. Каса адчынена штодня ад 2 гадз. дня. Па нядзелях і сэрадах ад 12 гадз. дня.

1-шы дзіцячы кіно-тэатр „ЮНЫ ПІЯНЭР"

КІНО СПАРТАК

Ад аўторка 15 кастрычніка выдатны фільм Цяжкія гады драма ў 9 частках. Пачатак 1 сэансу а 7 г. Каса—ад 5 г. 30 к

Кіно „ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ" Ад панядзелка, 21 кастрычніка

АРТЫСТКА ФІЛЬМЫ ХЭВЕР (вядомая па фільме «ЧЫКАГА») у амэрык. баявіку

РАДЫЁ І ЛЕЎ

ЗВЫШ ПРАГРАМЫ: ХРОНІКА „СОВКИНО" № 57

Пачатак 1-га сэансу а 7 г. Каса адкрыта ад 5 г.

Адчыненьне зімовага сэзону сымфанічных канцэртаў аркестру БЕЛРАДЫЁЦЭНТРУ

БЕЛДЗЯРЖТЭАТР. ПАНЯДЗЕЛАК, 21-га кастрычніка

1-шы СЫМФАНІЧНЫ КАНЦЭРТ

пад кіраўніцтвам А. БЯСЬСЬМЕРТНАГА.

Пры ўдзеле артыстых: О. НЕСЬЦЯРЭНКА (сопрано) і М. АРЛОВА (віолончэль).

У праграме: Р.-Корсакаў—«Шэхэразада»—сымф. паэма «па 1001 ночы»; Чайкоўскі—«Рококо»—вык. Арлоў; Чайкоўскі—Ліст Тацьцяны з оп. «Евгений Онегин», вык. Несьцярэнка; Чайкоўскі—Сюіта з балету «Лебядзіное возера».

Білеты ў рабочай касе, а ў дзень канцэрту ў касе тэатру ад 5-й гадзіны ўвечары.

Кіно „ПРАЛЕТАРЫ" Ад панядзелка 21 кастрычніка

НОВЫ ФІЛЬМ ВЫТВ. «САВКІНО» інсцэніроўка апавяданьня Максіма Горнага

КАІН І АРЦЕМ

жыцьцёвая драма ў 6 частках.

ГАЛОЎНЫЯ РОЛІ ВЫКОНВАЮЦЬ: АЛЕНА ЯГОРАВА (вядомая па фільмах «Кацярына Ізмайлава» і «Месяц зьлева»). МІКОЛА СІМАНАЎ («Кацярына Ізмайлава», «Кастусь Каліноўскі» і інш.).

Звыш праграмы Кіно-хроніка «САВКІНО» № 54

1. Бэрлін. Грандыёзная дэманстрацыя 1-ае жніўня арганізаванай кампартыяй.
2. Масква. Міжнародная дзіцячая канфэрэнцыя.
3. Карэльская АССР. Скончана пабудова канданскай паперовай фабрыкі.
4. Н.-Ноўгарад. Усталёўка кампрэсара на прыстані.
5. Масква. Газавая трывога на Ленінскіх гарах.

Пачатак а 7 гадз. 15 мін. | Каса—ад 6 гадз.

Кіно-тэатр „КУЛЬТУРА" АД ПАНЯДЗЕЛКА, 21 КАСТРЫЧНІКА

амэрыканская камэдыя ў 6 част.

З 1-М КРАСАВІКОМ

Рэжысэр Эдуард Грыфіт. У галоўнай ролі выдатны кіно-артысты Монты Вэнкс

Звыш праграмы—культурфільм у 3-х частках:

1) Палаваньне на гарылу, экспэдыцыя ў джунглях Афрыкі. Гарыла самая вялікая малпа, падобна на чалавека, увышні яна дасягае 2-х мэтраў.

2) Начное палаваньне на львоў. Вёска, якая вымерла ад сонной хваробы; сонная хвароба зьяўляецца ад атрутнага ўкусу мухі «ТУЭ-ТУЭ».

3) Вулькан „Мікэно" і інш.

Пачатак роўна а 7 гадз. увеч. Каса—з 5 гадз.

УВАГА: У рабочай касе прадаюцца абанэмэнтныя карткі для льготнага наведваньня кіно «Культура»

1-ы дзіцячы кіно-тэатр «ЮНЫ ПІЯНЭР» (будынак кіно «ПРАЛЕТАРЫ») АД ПАНЯДЗЕЛКА, 21 КАСТРЫЧНІКА

СЭРЦА АЗІІ (Афганістан)

Кіно-нарыс у 6 част. )—( Вытворчасьць „СОВКИНО"

— ЗВЫШ ПРАГРАМЫ ЦІКАВАЯ КАМЭДЫЯ —

ЯНКА ПІЯНЭР у 1 частцы

Каса адчынена штодня ад 2 гадз. дня. )—( Па нядзелях і сэрадах ад 12 гадз. дня.

— Цана білета 10 кап. )( Месцы нумараваныя —

Для здачы АБВЕСТКІ ў газэту „ЗЬВЯЗДА" звяраецца па тэл. 7-81

ЗГУБЛЕНА дамавая кніга дому № 49 па Старавіленскай вул. Гаеўскага М. Ф. Лічыць несапраўднай.

100 КАРТІН ХУДОЖЕСТВЕННЫЕ СОКРОВИЩА СССР

Подписчикам „Художественные сокровища СССР", состоящие из 100 больших многокрасочных картин и представляющих собой точные копии с лучших мировых произведений, хранящихся в Третьяковской галерее и других государственных музеях. „Художественные сокровища СССР" выходят выпусками по 4 картины. Все картины печатаются на прекрасной бумаге, наклеенной на ассорти, размером 35×47 см. К каждой картине дается об'яснительный текст, биография и гравюра автора.

Цена за все 100 картин в изящном прочном переплете—75 рублей. Условия рассрочки: при подписке—5 рублей, а остальная сумма выдается по 3 руб. 50 коп. по получении каждого выпуска (первый выпуск высылается бесплатно), пересылка 36 коп. за выпуск. Уплатившие всю подписную плату вперед получат переплет с первым выпуском и за пересылку. Подписка принимается: Москва, 6, Цветной бульв., 25, Художественному Акционерному Издательскому Обществу АХР.

ДА ВЕДАМА ЎСІХ ЧЛЕНАЎ АРУ

У сераду 23 кастрычніка, а 7 гадзіне ўвечары ў КЛЮБЕ ДРУКАРОЎ (Ленінская, 13)

адбудзецца

агульна-гарадзкі сход усіх сяброў АРУ г. Менску

АБВЕСТКА ДНЯ: 1) Справаздача рэспубліканскага бюро АРУ аб дзейнасьці Менскага АРУ (дакл. тав. ЛЕВІН), 2) грашовая справаздача аб'яднаньня за 1-ае паўгодзьдзе 1929 г. і зацьвярджэньне каштарысу на II-ое паўгодзьдзе 1929 г. (дакл. тав. РОЗЭНБЕРГ), 3) аб шэфстве АРУ над калгасамі (дакл. тав. ГОЛЬДБЕРГ)

Яўка ўсіх членаў АРУ абавязкова. Просьба не спазьніцца

МЕНАКРФА

даводзіць да ведама ўсіх устаноў і грамадзян, што ад 7-X г. г.

ПРАЦА Ў АКРФА ПЕРАВЕДЗЕНА НА БЕСЬПЕРАПЫННЫ РАБОЧЫ ТЫДЗЕНЬ

ЗАОЧНЫЕ ГОСКУРСЫ РОСПИСИ (РАЗРИСОВКИ). Роспись по всевозм. тканям: мягким золот., серебр., масляк., рельеф., эмалям. (не расплыв) красками. Бисер., жемчужн. и мерцающ. пересыпками. Роспись по сукну, стеклу, целлулоиду, коже и дереву. Полный курс, 12 уроков, в 4 месяца. К урокам дается свыше 100 рис. (кроме текстовых). По оконч. выд. свид. Умелья рис. не требуется. Проспект и программа высыл. за 20 коп. мелк. марк.

МОСКВА, УЛ. ДЗЕРЖИНСКОГО, Д. 7.

ЗАОЧНЫЕ КУРСЫ СОНО

ЗАОЧНЫЯ КУРСЫ БУХГАЛЬТЭРЫІ

Курсы рыхтуюць работнікаў для нізавых каапэрацыйных арганізацый, крэдытных таварыстваў, арцеляй усіх відаў, калгасаў, саўгасаў і г. д.

Тэрмін навучаньня 8 месяцаў.

Прымаюцца асобы з адукацыяй ня ніжэй 4 груп сямігодкі. Прыём адбываецца круглы год.

Скончыўшыя курсы атрымліваюць адпаведнае пасьведчаньне.

Плата за курс 33 руб. уносіцца так: 9 руб. пры паступленьні, з якіх 4 руб. залічваюцца за 8 месяц і па 4 руб. штомесячна ў пачатку кожнага навучальнага месяцу. Умовы прыёму высылаюцца за 2 дзесяцікапеечныя марки.

Грошы пераводзяцца па адрасе: Менск, Усекабанк, бяг. рахунак № 682. Усю карэспанденцыю накіроўваць: Менск Усекабанк, Завочным курсам.

ДА ЎВАГІ ЎСІХ БІБЛІЯТЭК

На падставе пастановы прэзыдыуму ЦСПСБ з кастрычніка 1929 г.

АРГАНІЗАВАЎСЯ

АБ'ЯДНАНЫ БІБЛІЯТЭЧНЫ (КНІЖНЫ) КАЛЕКТАР

(Менск, Дом Працы, 2-гі паверх, тэл. № 6-37)

КАЛЕКТАР бярэ на сябе нармальнае забесьпячэньне бібліятэк рэкамэндацыйнай літаратурай усіх выдавецтваў і камплектаваньне ўсякіх бібліятэк на беларускай, расійскай, яўрэйскай, польскай і інш. мовах.

КАЛЕКТАР па жаданьні бібліятэк дае ім кнігі ў аправе і поўнай бібліятэчнай апрацоўцы.

КАЛЕКТАР дапамагае бібліятэкам у справе прапаганды кнігі і па запатрабаваньні высылае рэкамэндацыйныя сьпісы.

ВЫДАВЕЦТВЫ: БЕЛДЗЯРЖВЫДАВЕЦТВА, ДЗЯРЖВЫДАВЕЦТВА РСФСР, РВА ЦСПСБ, ЦЭНТРВЫДАВЕЦТВА НАРОДАЎ СССР.

СЕКАРОВСКАЯ ЖИДКОСТЬ

ВЫТЯЖКА из семенных желез, приготовленная по способу проф. А. Ф. Блюмера

ПРЕЙСКУРАНТ ВЫСЫЛАЕТСЯ БЕСПЛАТНО

ЦЕНА ФЛАКОНА 2 РУБЛЯ ПЕРЕСЫЛКА ЗА НАШ СЧЕТ

ВРАЧАМ ДЛЯ ИСПЫТАНИЙ СКИДКА

ЛАБОРАТОРИЯ КООПЕРАТИВА ГАЛЕН-МОСКВА

Прыймо абвестак у чарговы нумар газэты адбываецца да 2 гадзіны дня

50 к. Кошт публікацыі аб згубе дакумэнты